Лех Валэнса ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Турыстычная Гайнаўка ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 33 (2675) Год LII | Беласток, 19 жніўня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

XIII Спасаўскія запусты ў сонцы

Хоць традыцыйныя бельскія спасаўскія запусты маглі б быць і ракавыя, паміж праліўнымі дажджамі, што змачылі б і мастакоў з іх струмэнтам, і разагнаць маглі б найбольш верную публіку, абышлося без прыкрасцей: арганізатары — павятовы аддзел Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Бельску ды Бельскі дом культуры ў нядзелю 12 жніўня заказалі надспадзяванае надвор'е для спеваў і гульняў багата сабранай у гарадскім амфітэатры публікі. „Даў жа Бог погодоньку на нашу работоньку!" — пачалі выступленне тры гурты: ад найменшых, якім нават часам не было і пяці гадоў, нядаўніх удзельнікаў майстар-школы ў БДК, якіх падтрымала тэатральная група „Антракт", пасля — два саставы студзіводскай „Жэмэрвы" ды маладзіцы, жанкі і бабулькі з ансамбля з-пад Камянца ў Беларусі (там жа славутая Белая вежа) — „Навіцкавічы". Прадстаўлены былі традыцыйныя жніўныя абрады, беларускія, падобныя па абодвух баках мяжы. Перад сцэнай на пляцоўцы ўвесь час бегалі малечы — новае пакаленне бяльшчан, спасярод якіх не адна асоба несумненна папоўніць склады бельскіх мастацкіх ансамбляў — тэатральных і спявачых, якія і сёння выступяць — „Васілёчкаў", „Курантаў", „Маланкі", а найперш дзіцячых, з бельскага Комплексу школ з беларускай мовай.

— Мае ўсе дзяўчаты паканчалі бельскую беларускую школу, — прабуе ўціхамірыць разгуляўшуюся ўнучку Сару Залеўскую бабуля Оля Кійко, родам з Казлоў. — І Анэта, і Эва, і Уля. Унучка ў мяне яшчэ толькі адна, ад сярэдняй дачкі, але пойдзе ў беларускі садок, а пасля ў „тройку" і ў ліцэй, хоць мы з іншага „раёна". Тата Сары — шляхціц з-пад Вышак, ды не супраць каб падтрымлівалі мы тут сваю традыцыю. А гэтыя беларускія мерапрыемствы — для нас асалода. Любім сваё. Каб такіх імпрэз было як найбольш! Не прапусцім ні аднае! І ў Студзіводы ходзім, на мерапрыемствы, якія ладзяць Фіёнікі. Проста — любім сваё.

Побач сядзіць пані Ірэна Галёнка, якая таксама вучылася ў „тройцы", цяпер беспрацоўная — абедзве яны, і пані Оля, і Ірэна, звязаны з бельскім шпіталем. Невясёлы час, ды пагуляць трэба.

Першыя гледачы паявіліся былі яшчэ далёка да пачатку свята. Гэты тыя, у каго больш часу — пенсіянеры, рантысты. Да культуры горнуцца тут людзі не толькі каб атрымаць як на талерцы, паслухаць. Дзядзька Мікола Таранта (родам з Шарнёў Арлянскай гміны), амаль усё жыццё аддаў Бельску, ад 1972 года (працаваў у камунальным прадпрыемстве, пасля ў „Эльве" — цяпер яна „Гопы", працаваў і ў кацельні; 20 гадоў у неспрыяльных умовах) сам таксама любіць спяваць. Што ж, „жыццё — як выжыць у неспрыяльных умовах" — можна горка ўсміхнуцца ды заспяваць. Больш займаўся б спевамі, ды калі адышоў на пенсію — ды ў яго работы пабольшала! — памагае сыну весці гаспадарку, будаваўся. Занятак ёсць, халестэрын гіне. Памагае ў царкоўным хоры — цяпер і хворым спяваюць у бальніцы, бо цяпер там багаслужба адбываецца. Духа дадаюць такія імпрэзы з роднай песняй. Лягчэй робіцца, паслухаеш, пабудзеш сярод сваіх. Можа і ў „Куранты" Мікола Таранта пайшоў бы, ды дайшоў бы абавязак, бо часта выступае, выязджае гэты мужчынскі бельскі хор. І так дзядзька Мікола, як усе гледачы, падпяваюць мастакам у ракавіне бельскага амфітэатра. У даглежаным парку Каралевы Алены, бельскай апякункі, расстаўлены латкі са смакоццем, рэкламны шацёр найбольшага спонсара — мультымедыйнай фірмы. А спансаравалі фэст павятовыя і гмінныя ды гарадскія бельскія ўлады, студзіводскі Музей малой айчыны, войты Чыжоўскай і Дубіцкай гмін. Бо весела запускаюцца сёння не ў адным Бельску — учора на III Падляшскапалескіх жніўных сустрэчах бавіліся і вучыліся ў Студзіводах, сёння артысты па чарзе даязджалі з Крывятыч. Моладзь супольна станцавала пад баян беларускія і польскія танцы (хоць інструменты прамоклі былі крыху ў лівень у Студзіводах), выступілі з фальклорнымі і папулярнымі песнямі „Жэмэрва", „Чыжавяне", бельскія „Куранты", „Васілёчкі", „Маланка" ды вучнёўскі „Капрыз", з Беластока даехалі „Лідэр" ды з „Цыганскімі чарамі" салістка Алена Руткоўская.

Вельмі шчыра адспявалі і паказалі традыцыйны абрад галасістыя цёткі з „Навіцкавіч". Некаторыя з іх не першы раз у Бельску. Цётка Тамара вяжа пярэвясла. На блузцы Валянціны арнамент шэра-блякла-ружовы — гэтае адзенне яшчэ яе бабулі, салярны ўзор быў чорна-чырвоны; „праўда, дзержымся?" З аднаго яны калгаса, ужо пенсіянеркі — Вера — былая даярка, Валянціна — брыгадзірша, аграном па адукацыі, Ніна — рабіла на харчовым перапрацоўчым заводзе. Ці ў Беларусі цяпер лепш жывецца? Хто працуе, той і мае. Абы было здароўе. Калгас працуе. „З ураджаем ужо справіліся, а ў вас яшчэ жнуць!" Гаспадар усюды бывае, бо „трэбо падывітысе" — бо ж і Прэзідэнт наведаў быў іх нядаўна. Ёсць чым весяліцца, бо што ж рабіць.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Зверху: Васіль Ляшчынскі і Альжбета Фіёнік — суарганізатары мерапрыемства

Беларускі феномен ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Апошнія пятнаццаць год мноства людзей з Заходняй Беларусі жыло з памежнага гандлю. Але зараз з захаду насунуўся дракон па імені „Шэнген". Правілы пераезду мяжы ўжо з лістапада бягучага года могуць істотна перамяніцца. „Дарога жыцця" для многіх грамадзянаў Беларусі напэўна закрыецца. Еўрапейская бюракратыя хоча ўзвесці новую жалезную заслону. Раней яе будавалі з Масквы, а зараз з Бруселя...

Прыпушчанскі народ ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Размова з Евай Мароз-Кэчынскай, этнолагам і антраполагам культуры, захавальнікам фондаў Прыродазнаўча-лясного музея Белавежскага нацыянальнага парку.

— У першых гадах XXI стагоддзя Вы рамантавалі бацькоўскую хату ў Новым Беразове і хацелі наладзіць у ёй і гаспадарчых будынках скансен. Як з гэтым атрымалася?

— Скансен дзейнічаў некалькі гадоў. Не было там білетаў, а асобы, з якімі я дамаўлялася, маглі паглядзець наш дом у Беразове, яго абсталяванне, гаспадарчыя будынкі і паслухаць маіх аповедаў...

Свята ў беларускім засценку (3) ☞ 5

Ганна КАНДРАЦЮК

У Беларусі найлепш забыцца пра «польскія» касцельныя звычаі. Ужо першы пункт праграмы — Працэсія Крыжавым шляхам, — памяняў мае ўяўленні пра гэты абрад. Да гэтай пары асацыяваўся ён мне з пераадольваннем прасторы. Наколькі нам трэба было наведаць аж 14 Станцыяў Паньскай пакуты, я падумала пра 5-7 кіламетраў вандравання. Як правіла, у дарозе мелі ўзнікаць перашкоды і складанасці, якія яшчэ больш прымусілі б думаць аб пакутах Збавіцеля. Таму, адразу пасля прыезду, я пераабулася ў выгадныя боты і ўзяла з сабой самыя неабходныя рэчы...

Ганіць „пэрэпеліцу" ☞ 8

Ніна БРУЧКО

Спёка, невыносная жара!

А чаму ж бы не, сяродак лета, па Пятры, у сам час пачалося жніва. Кругом на палях залаціцца каласістае жытка. Вакол над рэчкай зазелянеў маладзенькі другі пакос травы, атава. Кожная сям'я, зараз жа пасля адсвяткавання Пятра і Паўла, на другі ці трэці дзень бярэ ў рукі серп ды бутэлькі з вадой і гайда! — раненька на калёнію пачынаць жніва. Першы дзень — як святочны: пачынаецца з малітваю, апошні, пасля „злапання пэрэпеліцы" канчаецца песняю. Так працягваецца з дзеда-прадзеда. Да Спаса абавязкова ж трэба сабраць з поля ўсё збожжа...

9 770546 196000

Беларускі феномен

Гадоў праз пяцьдзесят сённяшняя беларуская гаспадарка будзе пільна вывучацца эканамістамі як загадка пачатку дваццаць першага стагоддзя. І пытанне тут зусім не ў яе бурлівым росквіце ці імклівым глыбокім заняпадзе. Ні першага (як падае афіцыйная дзяржаўная прапаганда), ні другога (як хочацца апазіцыйным колам і непрыхільнікам сённяшняй улады) не назіраецца. Рэч зусім у іншым — у тым, як людзі, звычайныя грамадзяне, не толькі выжываюць у нашым азіяцкім ладзе гаспадарання, але і застаюцца еўрапейцамі паводле стылю свайго жыцця. Кажу тут найперш пра гараджанаў, бо пра вяскоўцаў размова асобная. На вёсцы пануе вядомая яшчэ са школьных падручнікаў натуральная гаспадарка. Поле і лес, агарод і хлеў — вось асноўныя крыніцы дабрабыту вясковага жыхара. Ёсць яшчэ магчымасць пажывіцца рознымі матэрыяламі з пакінутых і занядбаных хатаў. Рэшту можна ўкрасці ў калгасе, які цяпер завецца пераважна сельскагаспадарчым кааператывам. Так і фармуецца вясковы пражыткавы мінімум. Амаль як у той старой беларускай показцы — усё з працы рук сваіх, нават грошы і тыя самы вырабляем. Бо на заробак у эквіваленце 80-100 долараў доўга не працягнеш. Гэта толькі ў дзяржаўных газетах даяркі атрымліваюць па 600 долараў (інфармацыя абсалютна афіцыйная). Многія хацелі б пабачыць хоць адну такую даярку і даведацца каго і як яна доіць.

Іншая з'ява беларускі горад. І з'ява, трэба сказаць, сюррэалістычная. Зразумець, адкуль людзі бяруць сродкі на моднае адзенне, новыя машыны, сучасныя кватэры і адпачынак на моры за мяжой папросту немагчыма. Тым больш, што кошты літаральна на ўсё растуць як вынікі маладых штангістаў на допінгу. Асабліва на нерухомую маёмасць. Цана аднолькавай кватэры ў Гродне цяпер такая ж як у Гданьску. А аналагічны рамонт кватэры, прыкладам, у Лодзі абыдзецца ў паўтары-два разы танней, чым у нашым горадзе над Нёманам. У Беларусі вельмі цяжка займацца бізнесам. Паводле міжнароднай статыстыкі наша краіна займае малапачэснае 2-е месца з 175 дзяржаваў па колькасці падаткаў — грамадзяне змушаны рабіць ажно 125 розных відаў плацяжоў. Яшчэ горш справы з гэтым толькі ў дыктатарскім Узбекістане. Наперадзе планеты ўсёй Беларусь па лёгкасці выплаты падаткаў (у сэнсе ў нас найбольш складана іх плаціць) — падлічана, што прадпрымальнікі на афармленне ўсіх справаздачаў і запаўненне дэкларацый трацяць больш 1100 гадзін у год (атрымліваецца больш 45 сутак!). Як кажуць, ад прыбытку галава не баліць. Але баліць ад процьмы інспектараў і кантралёраў, якія складаюць у беларускім грамадстве асобную касту „людзей з пасведчаннямі". У такіх няпростых варунках беларусы дэманструюць фенаменальную вынаходлівасць, прадпрымальнікі выжываюць і нават развіваюць сваю справу. Праўда, і тут кожны скіроўвае свае здольнасці і інтэлект паводле межаў уласнай маральнасці. Ведаю аднаго знакамітага ў горадзе бізнесоўца, які зарабіў свой капітал на падмане іншых. Такіх напэўна нямала, а ў масах насельніцтва даўно ўкаранёны стэрэатып „бізнесовец — значыць злодзей". Формула гэта культывавалася яшчэ з савецкага часу, калі прапаганда малявала вобразы імперыялістычнага капіталістычнага монстра.

Апошнія пятнаццаць год мноства людзей з Заходняй Беларусі жыло з памежнага гандлю. Але зараз з захаду насунуўся дракон па імені „Шэнген". Правілы пераезду мяжы ўжо з лістапада бягучага года могуць істотна перамяніцца. „Дарога жыцця" для многіх грамадзянаў Беларусі напэўна закрыецца. Еўрапейская бюракратыя хоча ўзвесці новую жалезную заслону. Раней яе будавалі з Масквы, а зараз з Бруселя. Нібыта зноў над беларусамі хочуць паставіць чарговы эксперымент на вытрымку і жыццяздольнасць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Непапулярныя ісціны

(працяг)

І здавалася б, пасля ўсяго сказанага, курс на нейкую мінібеларускасць у нашым рэгіёне нікога ўжо не здзівіць, і тым больш, не пакрыўдзіць, бо беларускасць, як бачым, моцна карысная як нам, беларусам, так і ўсяму нашаму рэгіёну і краіне. І так, зрэшты, дзеецца ва ўсіх сучасных цывілізаваных краінах — шануюцца іх нацыянальныя і этнічныя меншасці і дапамагаецца ім у іх нацыянальным развіцці. Карыстае на гэтым меншасць і напэўна не траціць большасць. Яны лепей узаемна пазнаюцца, інтэгруюцца і тым самым узбагачаюць сваю культуру і кансалідуюць грамадства. У такім выпадку меншасць яшчэ больш шануе сваю дзяржаву і лічыць сябе неад'емнай часткай краіны і грамадства.

Пашанавання правоў нацыянальных і этнічных меншасцей і ўмоў для іх нацыянальнага і культурнага развіцця патрабуе ад сваіх членаў Еўрасаюз. Ды і сама Польшча і грамадства яе вельмі чулыя на крыўды і абмежаванні нацыянальных правоў паланійных зямляцтваў, дзе б яны толькі не былі. І гэта, канешне, правільна...

А вось у сябе дома, на жаль, усялякае бывае. З вялікімі цяжкасцямі, як гаварылася, прабівалася беларускае школьніцтва. Нейк прабілася, жыве і мае ўжо чым пахваліцца. Нічым не зашкодзіла яно палякам, пальшчызне, а наадварот. Але і надалей існуюць там пэўныя непатрэбныя абмежаванні, напрыклад, штогадовае падаванне заяў, што дзіця хоча вучыцца беларускай мове. Нават у беларускіх ліцэях! Здавалася б, каму і на што яны патрэбныя?! Відаць, аднак, патрэбныя...

З яшчэ большымі цяжкасцямі адваёўваўся Супрасльскі манастыр і яго катакомбы. Дзякуй Богу ўспелі адваяваць і тым самым прадухіліць поўную іх руіну. Цяпер прыгожанька адбудоўваюцца і рэканструююцца яны. У манастырскіх будынках размясціўся філіял Беластоцкага музея — поўнасцю прысвечанага іконе. Ой, як скарысталі на гэтым не толькі праваслаўныя, але і Супрасль, і Беласточчына, і ўвесь наш край, бо як манастыр, так і музей ікон гэта проста жамчужына ў маштабе Еўропы і свету. Едуць туды турысты, аглядаюць, пішуць, хваляць...

А каб не адваявалі, то дасюль гэты унікальны помнік разваліўся б і загінуў...

Паявіліся новыя нашы беларускія справы — і зноў рэакцыя нашага грамадства крайне розная: ад станоўчай, праз абыякавую, да крайне адмоўнай, варожай. Чаго, маўляў, хочуць гэтыя беларусы?! Калі ім не падабаецца тут, то вон з Польшчы!..

А хочуць гэтыя беларусы надта ж нямнога. Менавіта: каб назвы гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, урочышчаў былі запісаны на ўказальніках і табліцах таксама і па-беларуску і на мясцовым арыгінальным гучанні. І каб беларуская мова атрымала статус дапаможнай мовы ў кантактах з чыноўнікамі. Канешне, толькі ў тых мясцовасцях, дзе беларусы складаюць значную частку грамадства...

Ці ж можа гэта камусьці перашкаджаць?!

Думаю, не. А быць прыдатным, карысным — і „оўшэм". Паўтараю яшчэ раз: так ёсць ва ўсіх цывілізаваных краінах. Зацікаўленне рэгіянальнымі традыцыямі і прывязанасцю да культур малых айчын усё ўзрастае ў свеце і ўзрастае. Савет Еўропы, напрыклад, які прадстаўляе 47 краін, выразна выступае за ўшанаванне правоў меншасцей і падтрымку разнароднасці. Дык чаго бесіцца нашым апанентам?..

Найсумнейшым аднак ва ўсім гэтым ёсць тое, што сярод нядобразычліўцаў нашых ёсць і нашы беларусы. Чым яны кіруюцца сказаць цяжка: ці проста не разумеюць шкоднасці сваіх учынкаў, ці штосьці яшчэ горшае?

Пачуўшы іранічную прапанову гайнаўскага раднага, каб прыхільнікі беларускасці выказвалі яе апранаючыся ў «haftowaną lnianą „rubaszkę przepasaną sznurkiem", haftowane „nohawicy", łapcie czy „czoboty"», так і хочацца зацытаваць класіка: „Над кем смеётесь, господа?"

Чым жылі і як жылі нашы продкі, нам, наследнікам іх, павінна быць святасцю, а не насмешкай, калі хочам „людзьмі звацца".

Амерыканцы, напрыклад, паставілі помнік „штанам, нагавіцам" — за іх выдатныя заслугі для Злучаных Штатаў. А беларусы павінны паставіць помнік „лапцям і перапаясанай шнурком рубашцы" — бо яны таксама моцна прыслужыліся беларусам. І гавару аб гэтым з пашанай і зусім сур'ёзна.

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Адчуваю сябе падманутым

У апошні час ездзіў я сабе па Польшчы, што дагэтуль у апошнія гады рэдка здаралася. Трапіў я м.інш. на некалькі дзён у Варшаву, пасля тыдня ў Гданьск. Вяртаўся з Гданьска ў Варшаву цягніком-экспрэсам. З Варшавы ехаў звычайным, хуткім цягніком толькі што з рэзервацыяй месцаў. У абодвух цягніках былі такія самыя месцы для сядзення, абодва ехалі чатыры з паловай гадзіны, у абодвух быў вагон-рэстаран. Адным словам, былі яны аднолькавыя. Ужо на вакзале ў Гданьску аказалася, што цана квітка першага на 30 злоты была большая, чым на той з Варшавы ў Гданьск. Я ніяк не мог гэтага ўцяміць. Толькі дзесьці за Мальбаркам адна пані, з якой я пачаў дыялог, растлумачыла мне, што гэты цягнік едзе ў Кракаў і да старой польскай сталіцы едучы з Варшавы нідзе не спыняецца, значыць, экспрэсам ён з'яўляецца фактычна адно на адрэзку паміж сталіцамі Польшчы. Кандуктар не быў у сіле мне высвятліць, чаму я, едучы толькі ў Варшаву, значыць, практычна не экспрэсам, мушу пераплачваць і да таго так дорага. Меў я ўражанне, што мяне звычайна абманулі.

Пасля майго вяртання ў Беласток трапіла мне ў рукі размова апублікаваная ў адной з лакальных газет з падляшскім дэпутатам ад Грамадзянскай платформы Робертам Тышкевічам, старшынёй Парламенцкага калектыву салідарнасці з Беларуссю. Ізноў адчуў я, быццам мяне ашукалі. Успамінаючы аб прамоцыі Беластока, заявіў ён м.інш. „Я хацеў бы засяродзіцца на тым маштабе, у якім я актыўны, значыць, на ўсходнім бачанні Беластока". Спадар дэпутат заявіў аб заснаванні тут няўрадавай арганізацыі, найлепш фонду, які займаўся б той усходняй уявай сталіцы рэгіёна. Чытаючы інтэрв'ю я меў уражанне, што спадар дэпутат выказваецца за такім фондам з-за зайздрасці. Крыўдуе ён на ўлады Беластока (цяпер звязаныя, дарэчы, з ягонай партыяй), што іншыя польскія цэнтры: Вроцлаў ці Познань, больш актыўныя ў прамоцыі беларускай культуры і рэгулярна разнавідныя беларускія мерапрыемствы там адбываюцца. Дэпутат Тышкевіч кажа: „Вроцлаў з'яўляецца сур'ёзным супернікам для Беластока..." Аб Познані: „Я заўважыў з нейкай трывогай, што ва ўсходнім напрамку актывізуецца Познань. Правялі там пару мерапрыемстваў у гэтай галіне, ведаю таксама аб пару помыслах у Трыгарадзе, пастаянна прысутнае таксама варшаўскае асяроддзе. Можа быць так, што грошы звязаныя з усходнім вымярэннем праляцяць нам каля носа".

Я не вельмі цямлю, аб чым гаворка ў спадара дэпутата. Ці гэта блага, што Вроцлаў, Познань, Трыгарад ці Варшава зацікаўлены беларушчынай? Адкуль столькі трывогі? Ці справа не ў тым, што еўрасаюзнымі ці ўрадавымі грашыма ў гэтай меры будзе карыстацца і карыстаецца хтосьці іншы, а не Беласток, значыць, дэфакта Грамадзянская платформа? Урэшце, якую ролю пасля заснавання такога фонду маглі б адыграць беларускія арганізацыі Беласточчыны, а, можа, нявыгадныя яны ў палітычных гульнях за здабыццё выбарчага электарату, як было ў апошніх самаўрадавых выбарах? Урэшце, ад студзеня, калі меў бы ўзнікнуць фонд дэпутата Тышкевіча, Польшча ўваходзіць у групу Шэнген. Ці спадар дэпутат, такі заклапочаны Беларуссю, намерваецца зрабіць штосьці, каб палегчыць кантакты грамадзянам Польшчы і Беларусі, хоць бы найперш тым, што пражываюць у памежнай паласе? Гэтая справа, спадар дэпутат, нашмат важнейшая, чым брацца за неразумную канкурэнцыю з Вроцлавам, Трыгарадам, Познанню ці Варшавай. А што з падтрымкай нашай радзіннай беларускай культуры?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Шкада мне беларускіх мас

З былым прэзідэнтам РП Лехам ВАЛЭНСАМ размаўляе Мацей Халадоўскі.

„Ніва": — Ці ў час Вашага прэзідэнцтва Польшча не забылася аб Беларусі, не адмовілася ў нейкі момант першых дзевяностых гадоў ад прынятай раней г.зв. двухнапрамкавай (Захад — Усход) замежнай палітыкі?

Лех Валэнса: — Не, гэта няпраўда. Я намерваўся супольна з беларусамі, украінцамі разам гэтую ігру весці: разам увайсці ў Еўрасаюз, разам увайсці ў НАТА. Я ўважліва пільнаваў, каб гэта нам так удалося. Вядома, такі быў мой план. Шмат з гэтага тыпу помыслаў можна было б тады зрабіць значна лепш ці інакш. Толькі што тады ў самой Польшчы было так многа праблем. З Захадам мы мусілі вырабляць розныя негацыяцыйныя фокусы. Не было тады, значыць, шмат часу на большае зацікаўленне, разгляд праблем, урэшце, дапамогу Беларусі. Была такая дынамічная сітуацыя будавання самой Польшчы, што проста на справы Беларусі не хапіла больш часу. Калі б хтосьці пазней на маім месцы лічыў, што можна было б лепш, дык чаму гэтага не зрабіў. То ж мой наступнік, мабыць, мог бы ўжо зрабіць больш. Я меў зашмат праблем у Польшчы. Я змагаўся з сістэмай, якая ўрэшце праваліласся. Я хацеў для Польшчы забеспячэння, але хацеў таксама, каб у гэтым маім напрамку беларусы ці ўкраінцы мяне зразумелі, што хопіць ужо боек, што калі мы будзем паміж сабою спрачацца, то нейкі трэці будзе на гэтым зарабляць. На нашых звадках заўсёды зарабляў хтосьці іншы. Я не мог таго сілай фарсіраваць, бо да таго трэба даспець. Пасля не хапіла мне часу, дык нават успамінаў у мяне няшмат з Беларусі. Тое, што нас з Беларуссю ці Украінай дзяліла, цяпер мае нас спалучаць. Гэта вымагла хоць бы тэхніка. Звадкі не прыносяць выгод. Ад мышлення ў катэгорыях краін пераходзім да мыслення аб кантыненце. Напрыклад, Вільню палякі могуць кахаць, ды мае яна быць еўрапейская. Так як Гданьск, не польскі ці нямецкі, а еўрапейскі. Падобна ўсе іншыя гарады, таксама і беларускія. Толькі што гэты час толькі становіцца. Памятаюцца яшчэ незлічоныя крыўды. Застанецца, мабыць, нейкі геаграфічны падзел на моры, кантыненты, горы. Іншых падзелаў ужо не будзе, як немагчыма падзяліць Інтэрнэт ці спадарожнікавае тэлебачанне.

— Вы гэтак гаворыце, а ў цэнтры Еўропы функцыянуе рэжым з усімі прыкметамі дыктатуры...

— Не адразу збудавалі Кракаў.

— А ці Вы, як лаўрэат Нобелеўскай прэміі, маглі б зрабіць што-небудзь, ці мо ўжо робіце, дзеля таго, каб падтрымаць беларускую дэмакратыю?

— Стараюся дапамагаць. Толькі што справы пайшлі ўвогуле інакш. Не магу цяпер уваходзіць у не мой свет. Я тады хацеў, каб з Беларуссю ці Украінай мы былі разам, ішлі адным тэмпам. А мае наступнікі пайшлі, вось, іначай, чым я ўяўляў. Тое, што наступіла пасля ва ўсходняй польскай замежнай палітыцы ніяк не ладзілася з маёй канцэпцыяй. Мелі быць ва ўсіх гэтых нашых імкненнях: роўнасць, салідарнасць, ніхто нікога не меў „уманеўрыроўваць" (падстаўляць). Пасля таго, як кончылася маё прэзідэнцтва, я не хацеў аб гэтым крычаць, каб свет не сказаў, што Польшча сілай хоча Беларусь ці Украіну цягнуць да дэмакратыі, сама „заводзіць" туды дэмакратыю. Сёння якраз стараюся толькі, прабую, ды ўсё, што наўкол адбываецца гэта не тая рэальнасць, якую я сабе ўяўляў.

Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Ці гэта значыць, што Ваш наступнік Аляксандр Кваснеўскі не меў „моцнай галавы" да размоў з палітыкамі Усходу: Беларусі, Украіны ці Расіі, якая дзякуючы Вашай „моцнай галаве" вывела савецкія войскі з Польшчы?

— Ён ніякай галавы не меў. Быў добрым адміністратарам. Прыгожа ўсміхаўся, зграбна паводзіў сябе. Гэта не быў, аднак, галоўнакамандуючы дзяржавай. Не меў помыслу, добрых планаў на Польшчу і свет. Меў свае малыя інтарэсікі. А ў мяне такія планы былі. Я гучна аб іх не гаварыў, бо нікога не хацеў палохаць, ды іх ажыццяўляў. Ён адміністраваў польскай бядой, іншым — па-за Польшчай — завельмі не цікавіўся.

— А ці сёння ў Вашых размовах з палітыкамі з г.зв. Захаду паяўляецца беларускі матыў?

— Пашырэнне Еўрасаюза было такое вялікае, што запанаваў хаос. У сапраўднасці гэты г.зв. Захад не меў сам на сябе помыслу. Заахвочваў нас да супольнасці ды без нейкай канкрэтнай праграмы. Сітуацыя пасля 1989 г. у гэтай нашай частцы Еўропы г.зв. Захад заспела больш чым нас саміх. Ён усё гэтым ашарашаны, не спраўляецца з гэтай праблемай, хацеў бы захаваць стары тэмп, магчыма на нас зарабляць, а ў сапраўднасці мае ён нас тамака. Наконт Беларусі цяпер тое ж самае. Стары Захад не мае падрыхтаванай сур'ёзнай бескарыслівай праграмы, салідарнай. Стары ЕС трохі паскорыў тэмп, ды генеральна гэтай тактыкі не хоча змяніць. Усё хочуць на Польшчы ці Беларусі толькі зарабляць. Няма ў ЕС палітыкаў з уявай будучыні, якія хацелі б нагнуцца ў нашым усходнім напрамку. З-за таго і Польшчы, і Беларусі нялёгка. Ды раней ці пазней, хоць бы толькі з прычыны тэхнічнага прагрэсу, Беларусь, і не толькі адна яна, у Еўропе мусіць быць у адным комплексе: грамадскай дэмакратыі, эканамічнага развою і бяспекі. Іншая сітуацыя, прынамсі на маю думку, немагчымая да ўяўлення.

— Ці пры Аляксандры Лукашэнку Беларусь можа быць незалежнай дзяржавай?

— Я праводзіў шмат размоў з Аляксандрам Лукашэнкам. На маю думку, ён не кажа таго, у што сапраўды гуляе. Прытвараецца лісіцай-хітрыцай. Бачыць, што зацікаўленне Захаду Беларуссю марнае, а з былых краін СССР падпарадкаванне Расіі і так найбольшае. Хоча пачакаць, аж Захад управіцца з сабою, прывядзе сябе ў парадак, павялічыцца яшчэ больш і за гэты час нічога Лукашэнку не ўцячэ з рук. Спадар Лукашэнка спачатку прабуе выдаіць Расію, пасля неяк там зарабіць на Захадзе. З такога пункту гледжання гэтая гульня нават і цікавая і для самой Беларусі ў нейкай меры і карысная. Ды, зразумела, у такой гульні паглыбляецца адлегласць Беларусі ад Захаду.

— А з Беларуссю трэба размаўляць праз Маскву?

— Перш за ўсё Масквы мы не павінны зневажаць. Расія гэта вялікая краіна хоць бы з-за сваёй табліцы Мендзялеева. Масква, якая з'яўляецца дэмакратычнай, не хоча нікога браць у захоп, не з'яўляецца гегемонам, усім падыходзіць, увесь свет хоча з такой Масквой наладжваць добрыя стасункі. Аднак ёсць праблема, як дапамагаць гэтай дэмакратычнай, вызваленчай Расіі і не дазволіць, каб адбудавалася гегемонія.

— Ды я вярнуся да пытання: ці абавязкова праз Маскву з Беларуссю трэба размаўляць?

— Ведаючы, як моцна Беларусь падпарадкаваная Расіі, нельга з Беларуссю ісці на канфрантацыю, разлічваючы на тое, што ўпадзе і сама ёй здасца. Каб не давесці да благога і калі мы фактычна гатовы падтрымліваць Беларусь і з ёй рэальна супрацоўнічаць, не паможам ёй, сілай адцягваючы яе ад Расіі. Трэба Расіі далікатна тлумачыць, што ў нашых беларускіх кантактах мы не супраць яе. Трэба пераконваць, што Расія будзе мець мацнейшага і багацейшага партнёра, калі толькі Беларусь будзе мець добрую заходнюю сістэму і тады будзе з яе мець большыя карысці. У гэтым значэнні трэба з Масквой размаўляць, каб не думала, што хочам вырваць ёй гэтыя краіны. У іншых аспектах, не. Усё ж Беларусь гэта свабодная краіна.

— У які, значыць, спосаб, падтрымліваць краіны гэтай Усходняй Еўропы, маю тут на думцы галоўным чынам Беларусь і Украіну?

— Перш за ўсё як найменш гаварыць, а найбольш рабіць.

— Што гэта значыць — рабіць?

— Размаўляць з мясцовымі ўладамі, самаўрадамі, кааперыраваць з легальнымі ўладамі, купляць, прадаваць тавары. Пазбягаць як толькі можна ў гэтых адносінах палітыкі. Сёння ў нашых стасунках зашмат змагання, а замала рэальнай канкрэтнай працы. Я стаўлю ў адносінах з Беларуссю на канкрэтнае і перш за ўсё на лакальныя, двухбаковыя размовы, такія, каб беларусы адчулі, што яны таксама маюць ад гэтага карысці для сябе. За ўсім гэтым урэшце пойдуць на Беларусі і іншыя змены.

— Польскія палітыкі, што займаюцца замежнымі справамі, прымяняюць у адносінах да Аляксандра Лукашэнкі і яго чыноўнікаў байкот, якога, як сцвярджаюць, патрабаваў ЕС.

— Байкот на хвіліну палітычна паспяховы. Аднак пасля адціскаецца ён на масах. А ў чым тыя масы вінаватыя, што маюць палітыкаў такога класа, а не іншага? Шкада мне гэтых беларускіх мас. Гэта добрыя людзі, ды не мелі шчасця, што ім якраз так, як ёсць, усё склалася. Трэба памятаць аб тым, як нашы дзеянні наконт Беларусі ўплываюць на масы, на звычайных працаўнікоў. Ад байкоту, калі крыўдзіць беларусаў, трэба ўцякаць.

— Ці, калі наступіць адпаведны момант, Польшча павінна так павесці сябе ў адносінах да Беларусі, як у час Аранжавай рэвалюцыі — да Украіны?

— Справа ў тым, што нам з Беларуссю ці Украінай наканавана быць сам-насам. Дык рабімце ж усё тое, каб гэтыя суседскія стасункі былі добрыя. Урэшце ж Бог даў нам такое. Польшча не павінна залішне ўмешвацца, каб не было ў Беларусі ці Украіне перакананння, што мы вось панства; справа ў партнёрстве. Трэба пытацца і ўва ўлады, і ў людзей, што ім прыслужылася б, а што ім перашкаджае. Не навязвацца, а паводзіць сябе разважліва і далікатна, памятаючы аб тым, што ва ўкраінцаў ці беларусаў вольныя рукі і маюць добрых, прыязных суседзяў. Адно толькі трэба, каб мы мелі падобныя сістэмы, г.зн. дзяржаўныя структуры і праграмы. У іншым выпадку проста супрацоўніцтва блага ідзе. А такое кепскае супрацоўніцтва выклікае варожасць. Сама сімпатыя гэта адно, ды трэба нам адно да аднаго прыладзіцца. Хацелася б, каб нам было бліжай не да Нью-Йорка, а якраз да Мінска ці Кіева. Польшча павінна актыўна дзейнічаць на тэрыторыях гэтых суседзяў, ды толькі для таго, каб узаемна дапасавацца, а не захапляць, адымаць.

— Ці Вы маеце на думцы пазіцыю толькі Польшчы, але і хоць бы Нямеччыны Ангелы Меркель або Францыі Нікала Сарказі?

— Слухайце пан, Еўропа, да якой мы давялі, не замыкаецца на краінах-дзяржавах. Таму дзяржаўныя структуры трэба павялічваць. Некаторыя самі павялічваюцца, хоць бы шляхам Інтэрнэту, электронных сродкаў інфармацыйнага пераказу. Але ёсць сферы, якім трэба дапамагчы, напрыклад, экалогіі, якой бяспеку трэба бачыць ва ўсім еўрапейскім кантэксце. У гэтай меры мы павін-

працяг ☞5

Кляшчэлеўскія святкаванні

27-29 ліпеня г.г. праходзілі святкаванні Дзён Кляшчэляў. Арганізатарам гэтай цыклічнай імпрэзы быў Гарадскі асяродак культуры. Дзесяць год таму арганізавалася Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі. Прэзасам таварыства (з першых дзён заснавання) быў Васіль Крупіч — навуковы работнік беластоцкага Політэхнічнага інстытута. Асноўнай мэтай таварыства ёсьць падтрымліванне традыцыі сваёй Малой айчыны і нацыянальнай тоеснасці, арганізаванне мастацкіх выставак ды выдавецкая дзейнасць. На працягу дзесяцігоддзя (сёлета адзначаўся юбілей існавання) былі арганізаваны выстаўкі мясцовых скульптараў і жывапісцаў, была выдадзена манаграфія Мікалая Рошчанкі „Кляшчэлі", а сёлета — мультымедыйная плітка „Наша гняздо", прысвечаная Кляшчэлеўскай гміне.

Арганізаваліся таксама спартыўныя мерапрыемствы, між іншым, турнір стральбы з лука, гульня ў пляжны гандбол ды валейбол, а ў нядзелю — завяршальным дні святкаванняў — арганізаваўся футбольны матч за прыз бурмістра горада між камандай „Ожэл" Кляшчэлі а камандай з Клеасіна. Вынікам 5:2 перамагла каманда гаспадароў, затым атрымала належны прыз.

У мастацкай частцы выступіў гурт „Каларыт" з Жабінкі ды „Катрынка" з Высокага з Рэспублікі Беларусь. Апрача згаданых выступілі „Мікстура" з Кляшчэляў, гурт з Беластока, танцавальныя пары з Гайнаўкі, якія прэзентавалі лаціна амерыканскія танцы ды калектыў „Турнёкі" з Бэскіду-Шлёнскага. Мерапрыемства завяршылася забавай, якая працягвалася далёка за поўнач. Да танца падыгрываў аркестр з Гайнаўкі. Як канстатавала спадарыня дырэктар, у святкаваннях удзельнічала шматлікая публіка з Кляшчэляў ды навакольных вёсак.

Уладзімір СІДАРУК

Справа з дошкай

Насупраць царквы, на абочыне вясковай вуліцы ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) паставілі дошку з каляровай картай Нараўчанскай гміны.

— Гэтая дошка з картай карыстаецца зацікаўленнем турыстаў, — сказаў карэспандэнту „Нівы" настаяцель Семяноўскага прыхода — і ўвогуле прыезджых асоб. Яны маюць магчымасць пазнаёміцца з месцапалажэннем Семяноўкі і іншых вёсак каля Семяноўскага вадасховішча.

Сёлета перад Вялікаднем вандалы зрабілі на карце непрыстойныя надпісы, якіх ніякім спосабам не даецца пазбавіцца. Але ж нейкі выхад можна знайсці.

Радныя з Семяноўкі выносілі справу на сесіі Рады Нараўчанскай гміны. Здавалася б, што да гэтай пары — праблему з дошкай войт вырашыў. Ды не. Праз столькі часу справа не зварухнулася з месца. Гэта ўжо не па-гаспадарску. Гэта і кпіны з прапаноў радных.

(мох)

Прыпушчанскі народ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Евай Мароз-Кэчынскай, этнолагам і антраполагам культуры, захавальнікам фондаў Прыродазнаўча-лясного музея Белавежскага нацыянальнага парку.

— У першых гадах XXI стагоддзя Вы рамантавалі бацькоўскую хату ў Новым Беразове і хацелі наладзіць у ёй і гаспадарчых будынках скансен. Як з гэтым атрымалася?

— Скансен дзейнічаў некалькі гадоў. Не было там білетаў, а асобы, з якімі я дамаўлялася, маглі паглядзець наш дом у Беразове, яго абсталяванне, гаспадарчыя будынкі і паслухаць маіх аповедаў. Расказвала я пра гісторыю сям'і і вёскі. Гаварыла пра мэблю, прылады працы і жыццё ў мінулым. Яшчэ і зараз можна са мной дамовіцца і я магу паказаць свой беразоўскі дом, які наведваю з мужам і дзяцьмі. Аднак не хачу ўжо для ўсіх распавядаць пра мінулае нашай сям'і.

— Вашы першыя працы не былі непасрэдна спалучаныя з вывучанай у вышэйшай установе прафесіяй.

— Мне трэба было зарабляць грошы і я спачатку займалася маркетынгам, працавала пры рэкламе і ў выдавецтве. Аднак грамадска я рабіла тое, што мяне цікавіла. У 1997 годзе ў Доме культуры ў Белавежы я пачала займацца міжрэгіянальнай адукацыяй. Працавала з дзеткамі і займалася рэдагаваннем мясцовай газеты. Супрацоўнічалі мы з „Зоркай" і ездзілі на арганізаваныя Ганнай Кандрацюк „Сустрэчы Зоркі", але гэта не падабалася майму кіраўніцтву. За мяшанне дзеткам у галаве беларускімі справамі я была звольнена з працы. Пасля вучням не хапала нашых сустрэч і яны прыходзілі да мяне дамоў. У Лондане я працавала і вучылася. Здабывала адукацыю і вопыт у музейных справах.

— У 2003 годзе Вы сталі працаваць у Белавежскім нацыянальным парку.

— Я пачала штатна працаваць згодна з вывучанай прафесіяй і займацца тым, што рабіла грамадска ад 1998 года. Менавіта ўспамагала я рэалізацыю праекта, у рамках якога аналізавалі мы ідэнтыфікацыю людзей з веравызнаннямі і нацыянальнасцямі, ставячы між іншым пытанне — „Кім ты ёсць?" Займаліся мы ў Белавежскай пушчы і яе наваколлі, па абодвух баках мяжы.

— Ці многа людзей удалося Вам апытаць?

— Да 2005 года апытаных было звыш тысячы асоб. З людзьмі працавала пад 60 студэнтаў, якія часта праводзілі дэталёвыя размовы. На аснове гэтых доследаў узнікла многа ліцэнзіяцкіх і магістэрскіх прац.

— Ці можна неяк абагульніць рэзультаты гэтых доследаў?

— У 90% людзі, адказваючы на пытанне „Кім ты ёсць?", называлі сваё веравызнанне.

— Што гаварылі людзі, якія пасля называлі сябе беларусамі?

— Многія асобы з Рэспублікі Беларусь, што называлі сябе беларусамі, не абапіраліся на сваёй культуры, але адклікаліся да адміністрацыйнага парадку. Тлумачылі, што яны беларусы, бо жывуць у Беларусі. Многія апытаныя з Рэспублікі Беларусь інфармавалі, што гавораць на рускай мове і слухаюць рускамоўныя тэлебачанне і радыё. Найбольш свядомых беларусаў сустрэлі мы ў Брэсце. У сёлах Беларусі людзі гавораць яшчэ на дыялектнай беларускай мове, але ўжываюць многа расійскіх слоў.

— Як адказвалі на апытанні жыхары прыпушчанскіх зямель з Польшчы?

— У нас многія людзі ў першую чаргу называлі сябе праваслаўнымі людзьмі.

Па вёсках беларусы заяўлялі, што гавораць дома па-свойму, а многія наймалодшыя — ужо на польскай мове. Многія выхадцы з вёсак, што жывуць у гарадах, сталі ўжо польскамоўнымі людзьмі.

— Ці жыхары прыпушчанскіх сёл называлі нейкія ўстановы або арганізацыі, што паўплывалі на іх беларускасць?

— Людзі звярталі ўвагу на навучанне беларускай мовы ў школах, гаварылі пра беларускамоўныя часопісы і беларускія мерапрыемствы. Асабліва старэйшыя апытаныя інфармавалі, што чытаюць „Ніву". Маладыя беларусы гаварылі аб дзейнасці Беларускага аб'яднання студэнтаў, „Басовішчы" і ўспаміналі пра Брацтва праваслаўнай моладзі. Частка маладых людзей гаварыла, што не любіць слухаць беларускіх фальклорных песень, а звяртала ўвагу на сучасную музыку.

— Апрача згаданага праекта Вы займаліся таксама іншымі ініцыятывамі, хаця б былі рэдактарам кніжкі „Краявід культуры рэгіёна Белавежскай пушчы", у якой звяртаецца ўвагу на многія культурныя помнікі. Якія ідэі добра было б зараз разгарнуць, каб прыцягнуць турыстаў на прыпушчанскія тэрыторыі?

— Распрацоўваліся праекты спалучаныя з „адкрытымі аканніцамі, бусламі і зубрамі", але яны не прыцягнулі да нас масавага турызму. Ініцыятыва „Lider Plus" не спраўдзілася. Ва ўсіх гмінах улады хочуць разгарнуць турызм, але кожная гміна павінна выпрацаваць для турыстаў сваю індывідуальную канцэпцыю. У справах падтрымкі беларускай культуры таксама павінен быць свой індывідуальны падыход.

— Зараз Вы працуеце як захавальнік фондаў Прыродазнаўча-лясного музея Белавежскага нацыянальнага парку, які апошнім часам быў вельмі багата і па-сучаснаму абсталяваны. Ці нейкія канцэпцыі з Вашага музея можна было б выкарыстаць у час канчатковага абсталявання Беларускага музея ў Гайнаўцы?

— У нашым музеі вельмі многа дарагой тэхнікі. Экспазіцыі накіраваныя на захапленне наведвальнікаў і выкліканне эмоцый. Аднак пасля гарантнай кансервацыі прыйдзецца нам вельмі многа плаціць за ўсялякія рамонтныя работы. Для прыкладу скажу, што ёсць тут электрычныя лямпачкі, якія каштуюць па дзве з паловай тысячы злотых. У Беларускім музеі ў Гайнаўцы цяпер многае абсталяванне выканае паводле распрацовак прывезеных з Усходу. Каб паставіць там дарагую тэхніку, трэба было б выдатковаць многа сродкаў, а ўтрыманне такога абсталявання таксама не было б пад сілу для ўладальнікаў гайнаўскага музея.

— Ці турысты, якія прыязджаюць паглядзець Белавежскую пушчу і наведваюць ваш прыродазнаўчы музей, цікавяцца беларускай культурай або праваслаўным веравызнаннем?

— Прыезджыя людзі найчасцей цікавяцца мясцовай культурай у цэлым. Звяртаюць яны ўвагу на цэрквы, касцёлы і іншую цікавую архітэктуру. Хочуць паразмаўляць з мясцовымі людзьмі пра іх жыццё. Аднак многія хочуць больш даведацца пра беларусаў і праваслаўнае веравызнанне.

— Зараз у калектыве пакліканым пры канцылярыі Прэзідэнта РП Леха Качынскага распрацоўваецца канцэпцыя пераўтварэння ўсёй тэрыторыі Белавежскай пушчы ў нацыянальны парк, што ўжо выклікае супярэчлівыя ацэнкі.

— Не ведаю я аб выніках працы гэтага калектыва, але чула, што ў Польшчы паявілася таксама канцэпцыя ліквідацыі нацыянальных паркаў, якіх тэрыторыямі ўпраўлялі б Дзяржаўныя лясы. На маю думку такая канцэпцыя з'яўляецца абсурднай прапановай.

— Мясцовыя людзі апасаюцца, што пасля стварэння на цэлай тэрыторыі Белавежскай пушчы нацыянальнага парку, не будзе дастатковай колькасці драўніны патрэбнай для іх і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, якія дзейнічаюць на прыпушчанскіх землях.

— Зараз самы вялікі пакупнік драўніны ў Гайнаўцы, гэта прадпрыемства „Фортэ". Купляе яно драўніну ў галоўным па-за нашай пушчай і многа мясцовых прадпрымальнікаў таксама купляе таннейшую сыравіну па-за нашым лесам. У прадпрыемствах, што займаюцца высечкай дрэў у Белавежскай пушчы працуе многа людзей, якія прыехалі сюды звонку.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Свята ў беларускім засценку (3)

Юры Гіль і Ян Гіль (з крыжам) вядуць працэсію

(пачатак у 31 н-ры)

У Беларусі найлепш забыцца пра «польскія» касцельныя звычаі. Ужо першы пункт праграмы — Працэсія Крыжавым шляхам, — памяняў мае ўяўленні пра гэты абрад. Да гэтай пары асацыяваўся ён мне з пераадольваннем прасторы. Наколькі нам трэба было наведаць аж 14 Станцыяў Паньскай пакуты, я падумала пра 5-7 кіламетраў вандравання. Як правіла, у дарозе мелі ўзнікаць перашкоды і складанасці, якія яшчэ больш прымусілі б думаць аб пакутах Збавіцеля. Таму, адразу пасля прыезду, я пераабулася ў выгадныя боты і ўзяла з сабой самыя неабходныя рэчы...

Апрача мяне ніхто з прысутных не збіраўся ў дарогу. І здаецца — толькі я адна выглядала тут святара! Для чалавека з самага рэлійнага рэгіёна Польшчы (Беласточчыны) цяжка было ўявіць нейкі касцельны рытуал без святара. Праўда, мне прыходзілася ўжо пабываць у Беларусі на багаслужбах, якія адпраўлялі самі жанчыны. Аднак гэта было ў прыканцы XX стагоддзя, калі касцёлы ды цэрквы цяпрелі недастатак кадраў.

І яшчэ здзівіў мяне новы імідж нашага вазака. Пан Янэк стаяў цяпер дастойна пасярод грамады ў белым стыхары з крыжом, быццам сапраўдны ксёндз. Побач — хлопцы са свечамі. Аднак ролю кіраўніка цырымоніі павёў сам гаспадар — Юры Гіль.

* * *

Першая станцыя пачыналася ўжо ля ўваходу ў панадворачак. Другая, трэцяя, чацвёртая, пятая... некалькі крокаў далей. Кожную з іх значылі дубовы бо жалезны крыжы, якія ўласнаручна ўзвёў Юры Гіль. Пры дзевятай станцыі была прачытаная малітва за ўпакой душы гаспадароў „Засцянковай хаткі": бабулі Анелі і дзеда Міхала, *мамусі* Феліцыі і *татуся* Пятруся, брата Чэсіка. Далей за апошніх членаў сям'і. І за ўсіх жыхароў Вашунава — у першую чаргу яго заснавальнікаў: Гіляў і Ляшчэвічаў (Бабуля Юры Гіля Анеля была з дому Ляшчэвічанка). Бо адчуванне народа пачынаецца ад свайго роду. Усіх нас «зляпілі» прародзічы на працягу пэўнага гістарычнага часу. Над намі знаходзіцца арбіта бацькоў, над бацькамі — бабулі і дзяды... З кожным пакаленнем наша роднасная сувязь падвойваецца. На трэцім калене ў нас 8 прабабак і прадзедаў, на пятым — 32, на дзесятым — 1 024. У часе гэта прыблізна толькі тры стагоддзі...

Так ці інакш, усе чатырнаццаць станцый мы абышлі амаль не рухаючыся з месца. Усе яны ўзведзены на ўчастку і панадворку Юрыя Гіля. Працэсія завяршылася ў святым кутку, ля вокнаў музея. Сам куток варты апісання, бо тут як нідзе выступае згустак сімвалаў, а іх спалучэнне ашарашыла б і караля поп-арту Эндзі Уорхала. У цэнтральным месцы знаходзіцца фігура Маці Божай (Блакітнай), названай тут Вашунаўскай. Яна апякунка засценка. Спавівае яе пластмасавы вянок і круг свечак. Фігура стаіць у зацэментаваным крузе ад студні. Ззаду бачым выяву Святой Сямі'і з Віфлеемскай зоркай са станіёлю і яслямі з сенам. (Уначы прыходзіла сюды да сеначка кабылка Уля). Побач стаіць гіпсавы помнік бусла на цокалі з бел-чырвона-белым-сцягам. Ёсць памятная дошка на акне, на якой чытаем: *Гэтая хата-музей з 1999 года носіць імя спадарства ГІЛЬ: Пятра (1904-1964) — Фэліцыі (1909-1989) — Чэслава (1933-1974) у сувязі з іх жыццёвым юбілеем 19+99 — Вечная памяць.*

Ёсць абраз Будслаўскай Божай маці, Гімн пра родны засценак, прэсавыя артыкулы пра Святкаванні ТБМ Віленскага краю, і чырвоны парасон з надпісам *Coca-cola...*

* * *

Ужо пры першай станцыі Крыжавой Дарогі ўразіла мяне веданне малітваў і абрадаў. Сям' я і госці, усе як адзін чалавек, маліліся на беларускай мове. З павагай, адданнем, дастойнасцю. Па-беларуску было зачытана Евангелле і выказана прамова.

Тут нашы карані і тут наша сіла, — прамаўляў вядучы. — Каб Усявышні Бог не дазволіў нам адрачыся ад Маці-зямелькі і не забыць родны кут! Дай Бог нам сіл!

Праз момант мне здалося, што знаходжуся ў іншым часе і прасторы. Магчыма, што зачаравала мяне тутэйшая цішыня. Месца, дзе маліліся сабраныя, напамінала вялікую паляну. Паветра і зямля пахацелі свежым сенам і балотнай зямлёй, якую вяночкам атуляў лес. У засценак вядзе толькі дарога ў адзін бок (у бок Параф'янава). На другім баку (у бок Полацка) стаіць лес, які можна праехаць адно на кані. Зямля мае міфалагічную абалонку. Дзесьці тут знаходзіцца легендарны Камень-кравец, з-пад якога, паводле легенды, выцякаюць адначасова дзве вялікія ракі Бярэзіна і Вілія. Яны бягуць у супрацьлеглыя бакі і значаць водападзел паміж Чорным і Байтыйскім морамі. Месца ведалі ўжо старажытныя грэкі і называлі яго Светлай Гарой.

Хата Куток

Ёсць і архітэктурна-гістарычныя атракцыёны. Непадалёк, у пасёлку Сітцы, знаходзяцца сярод старога парку руіны палаца Дамейкаў. Словам — ідэальнае месца для развіцця агратурызму або экалагічнай дзейнасці. Аднак паварот у родны кут не такі просты. Юры Гіль за сваё вяртанне і дзейнасць быў збіты міліцыяй і вярхушкай калгаса «Чырвоны сцяг».

Не трэба сюды прыязджаць і бадзяцца без справы, — сказала ў час судовага разгляду пракурор...

(працяг будзе)

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Шкада мне ...

3 ☞працяг

ны з аднаго боку падладжвацца, з іншага — даць свой дазвол. Вядома, трэба памятаць, што трэба пакінуць тое, што патрэбна для развою, для таго, што дае нам зарабіць, ды памятаць прытым аб усіх, не толькі аб паасобным паляку, французе ці немцу. Нашае шырока ўспрынятае пакаленне на гэтым свеце апынулася на этапе павялічвання структур. Таму няма пытання, дакуль сягае Еўропа. Трэба пакамбінаваць такое правіла, як у дарожным руху, што кожны можа весці машыну незалежна ад таго, ці гэта паляк, ці беларус, араб, яўрэй, белы ці негр.

— Ды ў слове і ў думцы існуе: Заходняя Еўропа, Усходняя Еўропа.

— Няма такога падзелу. Такое мышленне гэта мінулае. Тагачасныя межы, блокі, усходнія і заходнія сістэмы давялі да няроўнага развою. Блага весці машыну, калі хтосьці апынуўся ў цывілізацыі, дзе механічны конь „Трабанта" ці „Сірэны" замяняюць канём „Мерседэса" ці „Пэжо". Іначай пераключаецца хуткасць. Трэба раўняць узровень. Беларусь, Украіна, Польшча, Нямеччына, Францыя мусяць выраўноўваць узровень развою і спажывання і пасля ажыццявіць план: мы ўсе патрэбныя ў гэтым свеце. Праз хвіліну перад гэтай г.зв. Заходняй Еўропай стане пытанне: ці мае харчавацца ежай Польшчы, Францыі ці Нямеччыны, у якой таксама шмат хіміі, аж людзі свецяцца так што ноччу не заснуць, ці есці беларускія ці ўкраінскія харчы, ды без хіміі і таннейшыя. Вось гэта будзе выклік! Людзі захочуць спажываць, вядома, украінскія ці беларускія харчы, ды г.зв. Захад паставіць умову, напрыклад, такую: добра, хай так будзе, ды не будзеце вырабляць камбайнаў, бо і нашто, калі мы сваіх земляробаў пазбавім працы, палеткі засадзім лесам, ды ж і яны мусяць з чагосьці жыць, значыць, будзем весці вытворчасць камбайнаў у нас. Такая сістэма ў Еўропе стваралася пасля ўпадку камунізму.

— І наканец: як Вы ацэньваеце напрамак да адарвання Косава ад Сербіі? Ці дойдзе да чарговай балканскай вайны?

— Справа ў тым, што сённяшняе раздзяленне вядзе да таго, каб заўтра злучыцца. Справа Косава гэта справа мінуласці, думкі, што хтось кагосьці падмануў. Гэта так як з чэхамі і славакамі. Раздзяліліся, каб зноў з'яднацца ў адной Еўропе. Раздзяліліся, бо былі сілай спалучаны ў тую Чэхаславакію. Людзям з Косава і Сербіі трэба паказваць гэты прыклад, сказаць ім: калі хочаце, дык адрывайцеся, ды і так будзеце ў адной Еўропе. Канец крыўдам, няма ад іх выгад, мы ідзём да салідарнага сужыцця. Яно проста прыносіць выгаду. Калі хочуць жыць у адной Еўропе, дык яна такой канфрантацыі не жадае. Сербія і Косава мусяць пашукаць такіх развязак, якія яднаюць. Еўропа будзе ўз'яднанай ці гэта камусьці падабаецца ці не, дзеля свайго развою і бяспекі. Косава, Сербія мусяць мець такую самую сістэму, як апошняя Еўропа. Блага былі спалучаны, праз хвіліну мусяць спалучыцца разумна.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Вершы Віктара Шведа

Дыпламат

— Скажы мне, даражэнькі тата,
Каго завем мы дыпламатам?
— Дыпламат гэта мужчына,
Што памятаць заўжды павінен

Аб нараджэння жонкі даце,
Аб дарагім дарунку ў хаце,
Не ўспамінаючы ніколі,
Што ёй ужо гадочкаў болей.

Вынаходнік

Запыталі ў школе Вацка:
— Якой прафесіі твой бацька?
Ён адказаў: — Усе мы згодны,
Наш бацька гэта вынаходнік.

Заўсёды знойдзе ён прычыну
На ўсе жыццёвыя правіны.
Ніколі ён невінаваты,
Позна прыходзячы дахаты.

Фота Ганны Кандрацюк

Новая мода

Тхор Сцяпан
купіў сарафан
тхарыцы
Міліцы.
Ды куды адзене
такое адзенне
красуня тхарыца,
мілая Міліца?
Ці на вяселле,
ці на пакудзелле?
Мо на хрысціны
да ласкі Крысціны?
Сарафан харошы
(немалыя ж грошы
каштаваў Сцяпану,
нябеднаму пану;
не жыве ж Сцяпан
вышэй над свой стан!).
Ён пра жонку дбае:
корміць, апранае,
бароніць, кахае,
не горш за тхароў,
усіх гаспадароў.
Сарафан ядвабны,
Міліца прывабна,
рады і Сцяпан,
тхор з тхароў — а пан!
Выйшла Міліца
ў краму пахваліцца,
а мы на Міліцу
будзем усе дзівіцца
і пашыем самі
сабе сарафанік.
Хто ваўняны,
хто ільняны —
усе пані
і ўсе панны!

Міра ЛУКША

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ДВА ЮНАКІ Ў НЯСТОМНАЙ БАРАЦЬБЕ ВЫРАШАЛІ, КАМУ ЗАСТАЦЦА З ЛЮБАЙ ДЗЯЎЧЫНАЮ...

Аднойчы два добрыя хлопцы Алесь і Кастусь упадабалі адну дзяўчыну Гражынку. Дый як упадабалі! Не маглі ні жыць, ні хадзіць, ні есці, ні спаць. Што адзін, што другі: ну проста трызнілі аб'ектам свайго ўпадабенства і ледзь адначасна не захварэлі з той самай сэрцазнішчальнай гарачкі. А трэба сказаць, што Гражынцы падабаліся яны абодва аднолькава, так што...

Так што прыйшла пара ім самім неяк вырашаць гэты набалелы канфлікт. Ну а ў хлопцаў, ясная справа, хто мацнейшы ды спрытнейшы — той..., так, так, правільна вы здагадаліся: той і герой! І вырашылі нашы героі для пачатку з усяго разбегу трэснуцца галовамі: у каго гузак выскачыць страшнейшы ды сінейшы — той і павінен будзе саступіць. Вырашылі — зрабілі. І трэснуліся так, што і зоры разам убачылі, і гузакамі такімі ўзаемна ўзнагародзіліся, што так і не зразумелі, у каго той сінечы ды страшнечы на ілбе атрымалася болей. Тады ў пабітыя, але з таго не меней гарачыя галовы прайшла чарговая бліскучая ідэя: скочыць з „тарзанкі", прывязаўшыся да яе нагою, і хто з іх бліжэй да зямлі даляціць, той да Гражынкі цалаваць ейныя мілыя пальчыкі і пойдзе. Добра: прывязаліся, скочылі. І лёталі-гойдаліся-ўзнасіліся то да самуськай зямлі, то да высачэзных нябёсаў ад светлай раніцы да цямнюткай ночкі, пакуль ваш верны дзядзечка, праходзячы міма, тое дурноцце не заўважыў і ўшчэнт змарнелых, уніз галовамі вісячых спаборцаў ад „тарзанак" не адвязаў. Ну а назаўтра, толькі яны аддыхаліся, дык адразу за сваю не церпячую адкладання справу і ўзяліся. І дадумаліся. Да таго, да чаго да іх яшчэ не дадумваўся аніхто. Вырашылі Алеська з Кастусікам зрабіць па сапраўдным танку, на тых танках заехаць на двор да Гражынкі і па чарзе стрэліць-бабохнуць. Ды так, каб пералякалася дзяўчына ну проста на смерць. І ад чыйго стрэлу пералякаецца болей — значыць, таму з прыгажунькаю-мілюнькаю і заставацца. І пайшло тут у дзела ўсё! Куродыміла, скрыжэла, вішчала, дрыжэла, ірвалася, гнулася там і ламалася.

І раптам... От так бывае: прыходзіць раптам гэтае самае „раптам". Адкінуў Кастусік свой металёва-прабойны малаток, абтрос пыл з каленяў, падняўся, углядаючыся некуды ўдалячынь, і... І — проста пайшоў. Пайшоў паволі, расправіўшы плечы, лёгка ўсміхаючыся, нечаму свайму, толькі аднаму яму вядомаму.

З таго дня Алесь і Гражынка ходзяць за ручку разам. А Кастусь, як і ваш дзядзечка, ні аб чым, ні аб чым не шкадуе.

Дзядзечка Сід
2 жніўня 2007 г., Кобрын

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007 або
Муха ціп-топ на канікулах
— 6 —

Ганка хутка знайшла супольную мову з хлопцамі са сваёй групы. Разам з Філіпам, Адамам, Шыманам і Давідам яны размаўлялі па начах і *гнілі* з Шакальскіх.

— Мне здаецца, што на самай справе яны дурненькія, — сказаў Філіп. — Думаю, калі б мы ўцяклі з лагера, яны нічога не заўважылі б.

— Дык калі ўцякаем? — падхапіў Адам.

— Можа, заўтра? — прапанаваў Філіп.

— А ці я магу з вамі? — спыталася Ганка.

— Вядома, можаш, — усміхнуўся Філіп, — аднак, твае сяброўкі — не!

— Чаму? — здзівілася дзяўчына.

— Бо тады будзе нас зашмат і „Шакалы" здагадаюцца, што мы збеглі.

— Думаеш, што калі толькі мы ўцячэм, яны гэтага не прыкмецяць? — здзівілася Ганка.

— Уцячэм тады, калі будзем у лесе. З Лясковскім! — сказаў Філіп. — Ён з іх усіх найменш уцямны! Ён не здагадаецца!

— Тады можам рыхтавацца, — уздыхнула Ганка.

На наступны дзень у час заняткаў з Лясковскім нашы героі ў зручны момант схаваліся ў кусты. Пасля, калі настаўнік *ламаў* самых заядлых жулікаў, яны кінуліся наўцёкі, ды стралой паімчалі ў бок найбліжэйшай вёскі. Вёска Смальніца захапіла іх задбанасцю і вялікай колькасцю крамаў.

— Сустрэнем тут, пэўна, многа турыстаў, — падумала ўголас Ганка.

— І ўрэшце пакупаемся ў возеры, — аддаўся марам Шыман.

— А я галодны як воўк, — дадаў Адам. — Давайце найперш заглянем у краму і купім тое-сёе паесці.

У магазіне Ганка растраціла аж 50 злотых. Усе, дарэчы, купілі многа яды. Абрыдла ім тая касмічная страва на летніку. Пасля яе ўсе бегалі як апантаныя ў прыбіральню.

Ля Чорнага возера было шмат турыстаў. Нашы героі прыселі побач століка ў бары „Пад бабром". Непадалёк сядзелі дзве прыгажуні і голасна захапляліся нейкім хлапцом.

— Ах, які ён прыгожы! — гаварыла першая.

— Ён, пэўна, мае дзяўчыну, — сказала другая.

— О! Глядзі, Патрыцыя ідзе! — крыкнула першая.

І Ганка таксама глянула на канікулярнага донжуана. Яна таксама голасна крыкнула ад уражання:

— Міколка!!!

Хлапец быў рады, калі пабачыў Ганку.

— Што ты тут робіш? — спытаў ён.

— „Нягара" загадаў мне і дзяўчатам з'ездзіць на экстрымны лагер „Гардкор-2007". А сёння мы з хлопцамі ўцяклі з гэтага дурнога летніка, — сказала Ганка, якая хацела ўжо знаёміць Міколку з сябрамі.

— Мы знаёмыя яшчэ з дзіцячага садка, — сказаў Міколка. — Філіп — гэта мой сусед і самы лепшы сябра.

Хлопцы прывіталіся з Міколкам.

— А ты што тут робіш? — спытаў яго Адам.

— Я прыехаў сюды з бацькамі і малодшай сястрой, — адказаў Міколка.

— І табе не сумна? — спытала Ганка.

— Зусім не! Кожны дзень плаваю ў возеры, ганяюся сабе на ровары, а вечарам хаджу на дыскатэкі і падчапляю мясцовых прыгажунь.

— Супер! — захапіўся Філіп. — А мы на лагеры маем чорны *гардкор*!

— А чаму няма з вамі Басі, Касі і Соні? — спытаў хлапец.

— Бо яны ў іншых групах, — патлумачыў Шыман.

— Мы самі ўцяклі! — пахвалілася Ганка.

— Малайцы! — пахваліў іх Міколка і зараз жа спытаў у Ганкі:

— А ці ты бачыла ўжо тут Ляскоўскага?

— Ён жа... апякун нашай групы! — выгукнула са страхам дзяўчына.

— Тады лепш уцякайце, — Міколка разгледзеўся па баках: — Калі я ішоў у гэты бок, сустрэў Ляскоўскага з нейкай дзіўнай групай. Ён быў настолькі злосны, што нават не адказаў мне на прывітанне!

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@tlen.wp>

Польска-беларуская крыжаванка № 33



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 29 :

Смех, Парнас, перапёлка, бугай (птушка), няня, пах, лік, посуд, сон, крок, нос, нагода, струк, нырка. Вока, моц, порт, пупок, Пегас, рахунак, ой, дог, сон, раён, ды, лялька, кніжка, сваяк, на.

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Марыюш Харкевіч — Гайнаўка

Крыстыян Венцка — Нарва

Анна Недзведзь — Нараўка

Аніта Дмітрук — Бельск-Падляшскі

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Жніво

Бывала, калісьці,
Сярпом жыта жалі,
Сваё закончыўшы,
Суседу дапамагалі.

Потым былі дажынкі:
Пап'юць ды паспяваюць
І халоднай вадою
Усіх паабліваюць!

Хоць сусед з суседам
З-за мяжы сварыўся,
Памагчы калі трэба —
Пра ўсё забыўся.

Вёска жыла ў згодзе
І людзі дружылі,
У бядзе і ў горы
Іншых не забылі.

А цяпер: пагляньце,
Як вёска пражывае,
І адзін другому
Ніц не спагадае.

Нават родныя дзеткі
Пра бацькоў не дбаюць,
У дом састарэлых
Жыці пасылаюць.

Цяпер гэтак сумна
Стала ў вёсцы жыці,
Суседу з суседам
Не хочацца гаварыці...

Парада на доўгае жыццё

Хочаш жыці за сто лет,
Пар ды пі ты ліпаў цвет.
Хочаш мець многа вітамінаў,
То пі параны маліны.

Не шкадуй сабе і соку,
То не будуць балець бокі.
Збірай ягады брушніцы
І суніцы, і чарніцы

Ды кампотаў нагатуй
Ці варэння нарыхтуй,
Спажывай ты іх зімою,
Дык хварэць не будзеш болей.

Збірай зёлкі на гарбату
Пар ды пі яе ў ахвоту.
А калі злапае грып,
Пад пярыну хутчэй смык!

Як сагрэеш свае косці,
Грып уцякаць будзе са злосцю.
Тады знай дружочак-браце,
Весялей будзе ў хаце!

Не трэба штучных вітамінаў
Піўшы параны маліны.
Будзеш здаровы і бадзёры,
Зёлкі пражануць усе хворы.

Так без ніякіх хімікатаў
Будзь здаровы ды багаты!

Ганіць „пэрэпеліцу"

Спёка, невыносная жара!

А чаму ж бы не, сярэдак лета, па Пятры, у сам час пачалося жніва. Кругом на палях залаціцца каласістае жытка. Вакол над рэчкай зазелянеў маладзенькі другі пакос травы, атава. Кожная сям'я, зараз жа пасля адсвяткавання Пятра і Паўла, на другі ці трэці дзень бярэ ў рукі серп ды бутэлькі з вадой і гайда! — раненька на калёнію пачынаць жніва. Першы дзень — як святочны: пачынаецца з малітваю, апошні, пасля „злапання пэрэпэліцы" канчаецца песняю. Так працягваецца з дзеда-прадзеда. Да Спаса абавязкова ж трэба сабраць з поля ўсё збожжа. Праца цяжкая — увесь месяц згінацца ў спякоту з серпікам у руцэ. Пот з ілба цурком бяжыць, трашчыць спіна. Затое якая любата зайсці потым у клуню і паглядзець на абедзве стороны запоўненыя дабром — адну з пахучым сенам, другую з залацістым збожжам. Проста вочы разбягаюцца, а сэрца іграе. Будуць і каўбаска, і малачко, і румяныя булачкі.

* * *

За вокнамі балванее, у хаце робіцца штораз святлей. Разбудзілі мяне бразгат посуду, трэск двярэй. Мама варыць ежу. На падворку парыкваюць выбегшыя з хлява кароўкі, невядома чаму бляюць авечкі. Заіржала кабылка. Відаць, сястра выганяе быдла ў Грыднісак. Праз хвіліну ўсё аціхне, і я зноў засынаю.

— Уставай, дзетка, снедаць пара, сонца высока! — патрасла мяне за плячо бабуля. — Мне пара ісці на Грыднісак, Надзю памяняць, а то з голаду памрэ!

Я не спяшаючы працягнулася на пасцелі, глянула ў вокны, адкуль біў бляск сонца і памаленьку накіравалася ў кухню. Пахляпаўшы толькі нос, села за стол да сняданку. Бабуля паставіла місачку з грачанай кашай са скваркамі і кубачак малака, сама ўжо нічога не гаворачы трэснула дзвярыма і паспешна выйшла. Я задумалася: чым сёння заняцца?

Бацькі з найстарэйшай сястрой з самай раніцы, як толькі абсохла раса, пагналіся на калёнію пачынаць жніво. Калёнія была блізенька, не трэба валачыся з возам і канём. Толькі бацька часта сядаў вярхом на кабылку і ехаў на калёнію. Там быў кавалачак сакавітай травы... Суседзяў таксама нікога не відна, усе пры жнівах. Хаджу ад клуні да хлява, адкуль нясецца квіканне парасят, а ля шпіхерыка голасна, на ўсю дзюбу, дзярэцца рабая курыца. Ага, падумала я, хваліцца на ўвесь панадворак, а мо хоча спадабацца ганарыстаму пеўню! У гэту хвіліну адчыняе драўляную раз'езджаную брамку Надзя. У той момант данёсся ад недалёкіх суседзяў крык: „Хамула! Хамула! Хамула!". Ізноў Вінка з Маньканю, як амаль штодзень, дзяруцца. „Што за сёстры!" — абыякава кінула ўвагу Надзя і пабегла ў хату.

На вуліцы ні душы, толькі адзін дзядзька Хведар з цёткай Олькай спознена валакуцца на калёнію, трашчаць сваім жалезняком па бруку, аж рэха нясецца. Іхні конь лянівa клыпае, а цётка, у насунутай на нос белай хустцы, трымае сярпы ў руках, звесіўшы босыя ногі між прутамі драбінаў. Людзі з іх смяюцца: пакуль выжнуць, другія пачнуць капаць картоплю! Ім сёлета хіба будзе замерзне! Дзіўны гаспадар з гэтага дзядзькі Хведара — падумала я.

Фота Уладзіслава Завадскага

„Тата з сястрой павязалі снапы і паставілі ляшкі, каб на выпадак дажджу збожжа не змокла."

Трэба занесці вады Фрыську, сабаку пэўна хочацца піць. Мама ўчора зачыніла яго ў шпіхерыку: хтосьці яечкі і дровы нам крадзе. Казала: здалёку ніхто не прыходзіць, напэўна гэта „свой блізкі" злодзей... А, хай там, пабягу да Мані!

— Ты куды так спяшаешся? — зачапіла мяне ідучая насустрач з рукамі закладзенымі назад суседка Насця. — Манька дома?

— Няма, жыта на калёніі жне, — хуценька адказала я і адразу падумала: „Дарослая, а ходзіць па вуліцы, калі ўсе іншыя ў полі?" І прыпомнілася мне падслуханая размова цёткі Ганны з маёй мамай: „Лянівыя людзі працы не любяць, замест працаваць — лепш пагуляць". Я пакінула роздумы пра дарослых і бегам накіравалася на падворак сяброўкі.

Манін бацька не хадзіў часта ў поле, сядзеў, як і цяперака, і шыў чобаты людзям па заказу. Да работы ў полі наймаў людзей. Людзі не хацелі наймацца да дзядзькі, казалі — вельмі хітры, абдурыць.

Маня сядзела за сталом і ела скібку чорнага хлеба пашмараванага смятанай.

— Хутчэй канчай есці, — крыкнула я сяброўцы, — пойдзем на рэдзечку!

Маня кончыла хлеб, запіла малаком і мы выбеглі на вуліцу. Скрадаючыся, каб ніхто не ўбачыў, пабеглі проста ў агарод цёткі Ганны, якая ў той час, як і ўсе суседзі, з сям'ёю жала жыта, хіба ў Грыдніску. Нагалапужылі чырвонай рэдзечкі, нарвалі зялёных стручкоў салодкага гароху, узлезлі па драбінцы на стог з сенам, што стаяў у нас за клуняй і сталі аплятаць здабычу, аж вушы трасліся. „Каб толькі цётка не даведалася, хто таптаўся ў яе агародзе!"

Сонца хілілася на поўдні, паліла як у печы, нават куры схаваліся пад дашок. За вуліцай, пад высачэзнай грушай, старая Дземдзючка апершы аб яе пень галаву сядзела і спявала — то пачынала, то кончыла жаласлівую песню. Магла так прасядзець і паўдня — на поле ўжо не хадзіла, старая і сагнутая.

Некаторыя з суседзяў вярталіся дахаты паабедаць і адпачыць. Ды толькі тыя, хто меў блізка поле. Цётка Серафімка з дзядзькам Міхалкам забіралі рана з сабою ежу. Іх калёнія пад лесам, Рапчынаю, задалёка ад хаты. Тады сядалі пад ляшкам і паеўшы драмалі ў яго цяньку, пакуль міне найбольшая спякота. Потым працяглы дождж і грымоты маглі выгнаць жанцоў з поля. Ды калі дождж быў пралётны, хаваліся пад ляшкі на момант, каб праз хвіліну зноў жаць.

Вярнуліся з поля мае бацькі з сястрой. Сястра зразу ж бухнула на ложак, а мама занялася абедам. Тата на маю просьбу ўзяў даўжэзную тычку і давай збіваць чырванабокія, вялізныя фунтоўкі: ах, якія пахучыя, салодкія, мяккія...

— Хадзіце абедаць! — крыкнула мама, выйшаўшы на парог у сенцах.

На стале ўжо нарэзана ў талерцы сушаная ад Вялікадня каўбаска, увараныя раніцай яечкі, свежыя агуркі і сухаватыя кавалачкі хлеба. Мама з печы дастала яшчэ цёплы чырвоны боршч і наліла яго ў вялікую міску.

Кожная гаспадыня сушыла велікодныя куньпу і каўбасу і пратала іх у каморы, каб было што есці ў час цяжкіх жніўных працаў. Я дакладна прыглядалася кожнаму кавалачку: ці няма там чарвячкоў? А тата смяяўся: „О, каб ты пайшла са мной на работу, убачыла б, як густа чарвячкоў плавае ў місцы наваранай гаспадыняй капусты! Адгарнеш лыжкай, бывае, а есці мусіш — майстэрка цяжкая!"

— Хлеба ўжо амаль няма, мукі таксама, — пачала наракаць мама. — Так хутка з'ядаем, а цяпер няма часу ехаць у млын у Кожына, і грошай ніскуль. Даўно ў Бельску не была, прадала б там пару яечак...

— Пайдзі і пазыч у суседкі буханку ці палову. Будзе дождж, змелеш зерня з дзяўчатамі ў жорнах, — вырашыў бацька.

Жорны стаялі ў нас у палоўніку, кожны сусед меў такія самыя. Бо ж як жа можна было б жыць без жарон — малолі ў іх жыта на хлеб, пшаніцу на булачкі, авёс на кісель, грэчку на кашу. Я не раз прыглядалася, як сёстры круцяць, моцна трымаючыся за палок. І я сама прабавала, ды не зрушыла з месца — замала ў мяне, малое, сілы...

Пасля абеду Надзя зноў пайшла памяняць бабулю ў Грыднісак, а жанцы, аддыхнуўшыся, падрамаўшы, узяўшы халоднай вады з калодзежа, ізноў пайшлі на калёнію. Мама вярнулася падвечар першай — трэба было падаіць кароў. Бабуля прыгатавала вячэру: уварыла картопляў, зрабіла квас з агурком. Тата з сястрой павязалі снапы і паставілі ляшкі, каб на выпадак дажджу збожжа не змокла. Пасля вячэры, стомленыя, леглі спаць.

Ніна БРУЧКО

Хто каму — Гайнаўка турыстам — турысты Гайнаўцы?

Вось што турысты найчасцей запамятаюць з Гайнаўкі

Гайнаўка гэта дзіўнае месца. Здаецца маладому гораду дынамікі павінна хапаць, тым болей, што побач вельмі актыўна функцыянуе Белавежа. Можна было б сказаць, што гэта не такі вялікі плюс, бо турысты толькі спыняюцца на пакупкі ў супермаркетах, якіх на сённяшні дзень у Гайнаўцы не бракуе. Ніхто не бароніць спыняць іх у гэтым горадзе на даўжэйшы час, тым болей што папулярная ёсць апінія пра Гайнаўку як горад прыемны, спрыяльны адпачынку, зялёны і эстэтычны. Турысты, якія ў такі спосаб выказваюцца пры першай сустрэчы, здаюцца сведчыць пра патэнцыял, які з'яўляецца пунктам выхаду з застою. Безумоўна да такой сітуацыі ўсе прызнаюцца, але як, вядома, вінаватых няма, бо „ўсе робяць што магчыма, каб Гайнаўка стала прыцягальным горадам". Але каб гэта збылося, трэба прыняць напрамак на турызм, а, здаецца, улады, падыходзячы да справы вельмі спакойна і рацыянальна паводле іх, змяшчаюць яго на другім месцы прыярытэтаў, нават супольна з сельскай гаспадаркай, бо гэта дзве галіны, якія сябруюць з прэфіксам „эка". Надалей здаецца гаспадарча Гайнаўка падпарадкавана дрэваапрацоўчай прамысловасці, як гэта б не загучала...Традыцыю трэба захоўваць! Таму Гайнаўка падтрымлівае побач дрэваапрацоўкі, састарэлыя сістэмы прэзентацыі культуры.

Гэта не нараканні, маглі б імі быць, каб я надалей жыла ў Гайнаўцы, але я, падобна як большасць маіх сяброў, выехала адукавацца і не вярнулася. Таму паспрабую апісаць і, на колькі магчыма, халодна ацаніць сітуацыю ў Гайнаўцы наконт развіцця турызму і культуры. Тэма нялёгкая, кожны мае сваю перспектыву, бачыць пазітыўныя і адмоўныя бакі паасобных рашэнняў, але ўсе адным голасам кажуць, што фактычна турысты пераязджаюць праз Гайнаўку, а грошы пакідаюць у Белавежы, а каб дапоўніць вобраз трэба сказаць, што мноства гайнавян ездзіць на працу ў Белавежу... Можа гэта будзе прафесійная падрыхтоўка перад вяртаннем у Гайнаўку?

Яшчэ няхутка. Планы прастаравага добраўпарадкавання Гайнаўкі з'явіліся ўжо даўно, але галоўная задача горада — прыцягнуць інвестараў — яшчэ не выкананая. Здаецца, я паявілася ў добры момант на інтэрв'ю, бо як мне сказаў намеснік бурмістра Васіль Стэпанюк, якраз горад чакае адказу сур'ёзнага замежнага інвестара, які добра ацаніў самыя планы. Што ў Гайнаўцы трэба будаваць? На тое найхутчэй адказваюць самыя зацікаўленыя. Турысты падказваюць, што бракуе перад усім начлежных месц, наракаюць паўсюдна на якасць паслугаў, аб чым я чула, ад Цэнтра турызму па Гарадскую ўправу. Чакаюць гатэля на сярэднім узроўні з прафесіянальным сервісам, на што спадзявацца на гэты момант немагчыма. На сапраўдны аб'ект пачакаем, але паяўляецца, побач турыстаў, альтэрнатыўны ўспрымальнік турыстычнай інфраструктуры. Горад ганарыцца валейбалістамі, якія таксама распаўсюджваюць інфармацыі аб горадзе па ўсёй краіне, але апошнім часам у Гайнаўцы вялі трэніроўку футбалісты першай лігі, з беластоцкай Ягелоніі, толькі чаму жылі ў Белавежы. Жыццё самое дае адказы. Спартсмены наогул прывыклі да высокай якасці паслугаў, а іх забеспячэнне паспрыяе колькасці турыстаў з тоўстым кашальком, пакуль аднак чарга турыстаў, ужо з'явіліся планы развіцця асяродка спорту і рэкрэацыі, відавочна зразу прыярытэтнасць спраў, але проста спартыўныя інвестыцыі ў сённяшняй сітуацыі могуць аказацца больш карыснымі.

Што бачыць чалавек, які ўпершыню прыязджае ў Гайнаўку? Першае, шмат зялёных абшараў, што аддае характар прыпушчанскай мясцовасці, а з другога боку сведчыць пра якасць паветра, на што спадзяюцца ўсе, якія прыязджаюць на адпачынак. Гайнаўка сама ў сабе заахвочвае да шпацыраў, але аказваецца, што прынамсі ў наваколлі цэнтра да нядаўна можна было пералічваць колькасць рамонтаў, але спадар Стэпанюк дадаў у размове, што гэта доўга трывае, бо ў гэтым годзе большасць дарожных рамонтаў фінансавана толькі з гарадскіх сродкаў. Але што важнае ў гэтым кантэксце, не чуваць у голасе нараканння, гэта надзейна, што і ўлады, а як вынікае з доследаў і жыхары Гайнаўкі таксама ўпэўнены ў сваіх магчымасцях, не чакаюць бескрытычна дапамогі пад дыктоўку цэнтральных устаноў, хацець значыцца, змагчы! Толькі здаецца яшчэ не цяпер. Вернемся да нашага турыста, шпацыруе па горадзе і напэўна бачыць царкоўныя купалы і каб быць справядлівым — касцёл, але тых у Польшчы больш чым цэркваў, таму большае зацікаўленне прыцягвае праваслаўны аб'ект. Месца важнае, бо і характэрнае для Падляшша, так характэрнае, што паводле некаторых сяброў Гарадской рады хапае для адрознення Гайнаўкі ад іншых гарадоў і не патрабуе яна двухмоўных табліцаў. Намеснік бурмістра прызнаецца, што ён прыхільнік дзеяння ў бок стварэння своеасаблівага і характэрнага аблічча горада, чаму паспрыяюць, між іншым, двухмоўныя назовы. Пакуль што яшчэ пісьмовай прапановы няма, але як пры ўсім магчымасці ёсць, тым больш што пасля доўгіх, у большасці несутнасных дыскусій у час пасяджэнняў Рады, Гайнаўка функцыянуе ў спіску гарадоў з дапаможнай мовай, а гэта чаканы многімі вынік Закону аб нацыянальных меншасцях. Працаўнікі староства выказваюцца больш памяркоўна на гэтую тэму, часцей чым пра атракцыйнасць двухмоўя, чаго яму аднак не адмаўляюць, звяртаюць заўвагу на шырокае поле грамадскай дыскусіі, а яна не аблягчае праблемы, часцей антаганізуе жыхароў Гайнаўкі. Справа, пэўна, хутка не вырашыцца, таму астаюцца заклікі да здаровага розуму. Наш турыст ідзе далей. Найчасцей мясцовых не распытваецца пра колькасць і размяшчэнне цікавых месц, а проста пра нейкі інфармацыйны цэнтр. Уфф! Дзякуй Богу сёння адзіны Цэнтр турызму ў горадзе змяшчаецца там, дзе проста кожны падумае. На пытанне дзе, пачула адказ: „Там, дзе Орбіс", а пасля тлумачэнне, як туды патрапіць. Традыцыйна гэта месца асацыюецца з турызмам, не ведаю ці так лёгка было б пры іншым размяшчэнні. Ёсць шанс на чарговы інфармацыйны пункт, але горад думае над яго лакалізацыяй. Гэта не такая маленькая праблема, хапае сказаць, што староства аплачвае гораду памяшканне Цэнтра турызму, а трэба было б спытацца, хто тут працуе за каго, на каго і дзеля чаго? У выпадку, калі Гайнаўка будзе думаць задоўга, ёсць ахвотныя на інфакіёскі. Іх узнікненне забяспечвае праграма, якую рэалізуе гайнаўскае староства. Такую патрэбу заявілі Нараўка, якая заўсёды ахвотна супрацоўнічае, Чыжы, на якіх актыўнасць староства таксама не наракае, падобна і Дубічы-Царкоўныя, але таксама Белавежа. Гэта амаль сенсацыя, бо Белавежа з Гайнаўкай неахвотна дагэтуль супрацоўнічалі. Белавежа закідвала Гайнаўцы мэтанакіраванае дзеянне ўбок захоплівання турыстаў. Але ці гэта рацыянальны закід? Усё-такі, напрамак змяняецца і Белавежа ў апініі староства прыбліжаецца. Гэта, думаю, дае надзею на будучыню. Пэўна і адзін з інфакіёскаў знойдзе месца ў Белавежы. Гэта было б нават сэнсоўна, каб аднак Гайнаўка не асталася надалей з праблемай інфармацыі. Можа добра было б, каб проста горад са свайго боку падумаў пра інфармацыйны шапік. Патрэба ёсць, што паказвае праца Цэнтра турызму. Цэнтр выконвае заадно інфармацыйную функцыю, але і збірае ўсе пытанні, праблемы ад наведвальнікаў, што дапаўняе вынікі штогадовага апытання сярод турыстаў. Варта сказаць пра высновы. Аказваецца, што найбольш турысты патрабуюць ІНФАРМАЦЫІ. Пра інфраструктуру выказваюцца з сярэднім задавальненнем. Наракаюць на недахоп месцаў для пікнікаў ды гастранамічных пунктаў. Галоўным прадуктам з'яўляецца ўсё ж такі Белавежская пушча і зубр. Добра было б, каб у запаведнікі і на шляхі турысты выязджалі з Гайнаўкі ў падобнай ступені, як з Белавежы. Зноўку вяртаецца праблема гатэляў. Не прынаджвае агратурызм, бо гэта не мэта і спадзяванне большасці турыстаў. Толькі частка хоча жыць на прыватных кватэрах, многа таксама залежыць ад іх умоў. Дынаміка развіцця агратурызму даволі высокая ў Гайнаўскім павеце, але прапановы і ўмовы не заўсёды турыстам адпавядаюць. Ёсць каму рыхтаваць месца. Як паказваюць статыстыкі з Цэнтра турызму наведвальнікі прыязджаюць абсалютна з цэлай Польшчы і цэлай Еўропы. Пэўна і з-за акіяна таксама, не ўсе проста заглядаюць у гайнаўскі цэнтр. Адпачываюць працяг ☞11

Апошнім часам ва Ўсходняй Еўропе ўсё гучней заяўляе аб сабе агратурызм і ўсё, што з ім звязана. Усё больш жыхароў Беласточчыны знаходзяць працу менавіта ў гэтай галіне, што натуральна — прыгожыя мясціны і добрыя людзі — вось асноўныя чыннікі развіцця агратурыстычнага бізнесу.

Агратурызм у Беларусі ці, як яго там часцей называюць — экатурызм, з'явіўся адносна нядаўна. Можа ён і развіваўся б хутчэй, але ўнутраная палітыка лукашэнкаўскай улады, накіраваная на прыцісненне эканамічна амбітных людзей, не дае гэтаму віду справы заняць належнае месца сярод заняткаў сельскага насельніцтва. Праўда, як кажуць, талент заўсёды знойдзе сабе дарогу. І яна можа называцца „Зялёным шляхам". Менавіта па „Зялёных шляхах" Беларусі мы выправімся ў віртуальную агратурыстычную вандроўку.

Пачаць яе можна набраўшы адрас у інтэрнэце: http://www.greenways.by. Перад намі адкрыецца першая старонка сайта, зробленая ў традыцыйнай, але ў той жа час арыгінальнай форме. Уверсе выяўлення можна пабачыць невялікія анімацыйныя карцінкі, якія адразу ствараюць добры настрой.

Старонка падзеленая на тры часткі. Паколькі сайт не з'яўляецца навінным, толькі інфармацыйным, то ўсе апошнія падзеі, якія тычацца беларускага агратурызму, падаюцца ў выглядзе асобных банэраў. Адзін з такіх месціцца адразу пад словамі вітання і запрашае да ровернай вандроўкі салідарнасці з „турыстычнай Беларусьсю", якая мусіць пачацца ў сярэдзіне жніўня.

Але вернемся да ўласна беларускіх „Зялёных шляхоў". „Такія маршруты аб'ядноўваюць рэгіёны, турысцкія славутасці і мясцовыя ініцыятывы, — пераконваюць нас у вартасці скарыстацца з іх распрацоўшчыкі сайта. — Яны падтрымліваюць развіццё турызму і адпачынку, спрыяльнага для навакольнага асяроддзя, прапагандуючы здаровы лад жыцця і формы перамяшчэння без матораў — велатурызм, пешы турызм, на канях, водны турызм і інш. Адначасова такія маршруты ствараюць магчымасці для паляпшэння ўзроўню жыцця і стану навакольнага асяроддзя, ажыўлення мясцовай эканомікі, пасоўвання рэгіянальнай прадукцыі і развіцця прадпрымальніцтва сярод сельскіх жыхароў, а таксама захавання унікальных прыродных, ландшафтных і культурных каштоўнасцяў". Усё гэта добра, але далей падаецца карта гэтых самых беларускіх „Зялёных шляхоў". Ведаючы, як развіваецца агратурызм у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, глядзець на ўсяго чатыры прапанаваныя маршруты ў Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях нават прыкра.

З правага боку выяўлення гэтыя чатыры „Зялёныя шляхі" называюцца сеткай. Застаецца спадзявацца, што надыдзе час, калі зачынальнікі беларускага агратурыстычнага руху будуць распавядаць шматлікай аўдыторыі сваіх прадаўжальнікаў справы, як цяжка ім было пачынаць і як яны перамагалі процідзеянне тагачаснай беларускай улады.

Уласна ж беларускі агратурызм яшчэ зусім малады. Як распавядаюць натхняльнікі сайта, які, дарэчы, мае не толькі беларускую, але і польскую, рускую і англійскую моўныя версіі, ён пачаўся з 2002 года са стварэння арганізацыі „Агра і экатурызм", выйсце на партал якога месціцца ў „гістарычнай" рубрыцы „Зялёных шляхоў". Праўда, той сайт шматмоўнасцю не вызначаецца — усё падаецца выключна па-руску.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Бедны баскетбол

Баскетбол у Беларусі сёння ёсць найбольш сірочым з усіх гульнёвых відаў спорту. Прыярытэты аддаюцца найперш хакею, куды дзяржавай накіроўваюцца вялікія сродкі, не назавеш гаротнымі і футбалістаў. Апошні час узяліся адраджаць айчынны гандбол, які мае найбольшыя гістарычныя дасягненні. І нават валейбол займеў свайго сталага фундатара. І толькі беларускі баскетбол, які даў свету некалькі алімпійскіх чэмпіёнаў і прызёраў (Іван Ядэшка, Тацяна Белашапка, Ірына Сумнікава, Алена Швайбовіч, Галіна Савіцкая), не мае ні тытульнага спонсара, ні аналагічнай дзяржаўнай падтрымкі, ні належнага асвятлення ў прэсе і на тэлеэкране.

Усё бягучае лета прыходзілі скупыя звесткі пра бляклыя выступы айчынных нацыянальных зборных маладога і юнага веку на топ-турнірах. Як правіла, там беларусы займаюць месцы ў хвасце. Маленькім праменьчыкам святла стаў выступ дзяўчынак да 16 гадоў на чэмпіянаце Еўропы, што прайшоў у Латвіі. На ім нашы кадэткі занялі агульнае 9-е месца. На тле хранічных паразаў іншых моладзевых і юнацкіх зборных гэта пэўны поспех. Вучыць азам папулярнай гульні дзяўчат гарадзенская трэнерка Вікторыя Дацун (жонка вядомага трэнера жаночых камандаў Аляксандра Шымкавяка). Яе выхаванкі, праўда, не змаглі выйсці з групы ў васьмёрку мацнейшых. Але ў міні-турніры за 9-12 месцы сапраўды разыграліся, адолеўшы Бельгію, а потым Польшчу (сваіх заходніх суседак беларускі на гэтым турніры перамаглі двойчы). Асабліва варта адзначыць „зорачку" Марыю Філончык — вельмі верагодна, што з юнай цэнтравой вырасце баскетбалістка міжнароднага класа.

Тым часам дарослая жаночая дружына ў Мінску рыхтуецца да фінальнай часткі першынства кантынента. Прабіліся туды беларускі ўпершыню ў гісторыі, так што сам факт дае падставы штуршка да развіцця. Зборная, якую вядзе Анатоль Буяльскі, ужо зазнала першыя страты: з абоймы вываліліся дасведчаныя Анжэла Дубойская і Вольга Масіленіне. Дубойская нечакана сама пакінула збор, не растлумачыўшы нікому прычынаў. А ў Масіленіне зноў абвастрыліся старыя праблемы — сямейныя, клубныя, візава-пашпартныя — так што трэнерскі штаб не захацеў больш дурыць сабе галаву. Але найбольш хвалюе траўма беларускай цэнтравой Анастасіі Верамеенкі, якой баліць спіна. Такія ж праблемы і ў Юліі Дурэйкі — наступствы заганнага трэніровачнага працэсу, калі маладых баскетбалістак перагружаюць фізічна.

Мужчынская баскетбольная дружына рашае куды больш прыземленыя заданні. На павестцы дня паядынак з Нідэрландамі, якіх трэба перамагчы ў гасцях. Толькі ў такім разе можна будзе выйсці ў вышэйшы свет. У плане падрыхтоўкі падначаленыя Аляксандра Барысава ўпершыню за апошнія гады ўзялі ўдзел у сур'ёзным міжнародным турніры, які быў прымеркаваны да 50-гадовага юбілею вялікага майстра баскетбола Валдзіса Валтэрса. У сталіцы Латвіі сярод прадстаўленага квартэта беларусы занялі трэцяе месца. У стартавым матчы нашы адолелі моцную каманду Новай Зеландыі (на апошнім чэмпіянаце свету яна была ў васьмёрцы грандаў) — 77:74, потым былі разгромлены гаспадарамі — 52:84 (урэшце Латвія стала пераможцам турніру), а напрыканцы ў зацятым змаганні саступілі гучнай па імёнах Літве — 90:96. Турнір зноў падкрэсліў беларускую застарэлую праблему — брак кваліфікаваных кадраў. І гэтая праблема развяжацца, відаць, не хутка.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

ЗАМАЛЁЎКІ З ПАДАРОЖЖА

Нядзелю 29 ліпеня рашыў я правесці на веласіпеднай прагулцы. Мэту падарожжа назначыў па маршруце: Кузава — Чаромха-Станцыя — Ставішчы — Полаўцы, затым пагранпераход Полаўцы — Пяшчатка. Ад чатырох месяцаў заседжваюся ў хаце. Няма з кім паехаць за мяжу на аўтамабілі. Калега, з якім я раней спадарожнічаў, адмовіўся пасля таго, як беларускія вайскоўцы ўчынілі мне скандал (чытай: „У чарзе на пляцоўцы", „Ніва" № 15 ад 15 красавіка 2007 г.). А навінкі наконт перасякання мяжы даходзілі да мяне штораз цікавейшыя. Вось і рашыў я праверыць.

Надвор'е паспрыяла для вандроўкі. Хоць сонца на адвячорку паніжалася, а вецярок студзіў цела, дык прагулка на ровары здавалася быць цудоўным рэляксам для здароўя. З хаты выехаў я а 16 гадзіне і лічыў, што праз дзве гадзіны вярнуся дамоў. Не атрымалася. У Ставішчах сустрэў калегу, Грышу Рошчанку, з якім у пачатковай школе вучыліся. Зараз ён пенсіянер, пражывае ў Плоцку. У Ставішчы заязджае час ад часу, каб наведаць сваіх ды за маёмасцю паглядзець. Грыша — цікавы чалавек. У старэнькай хаце прыстасаваў своеасаблівы куточак для старых рэчаў. Апошнім разам мы бачыліся больш за пяць гадоў таму („На добры ўспамін маладым", „Ніва" № 37 ад 16.09.2001 г.). А, здаецца, што гэта было ўчора. Перад вачыма бачу невялічкае памяшканне загружанае старымі рэчамі: маслабойка, якою карысталіся вясковыя гаспадыні, гліняныя ды чыгунныя гаршчкі, ліхтарыкі рознага віду, ручнікі ды сурвэткі рукадзельнай вышыўкі, маляваная скрыня на бялізну, плеценая з лазы дзіцячая калыска завешаная на бэльцы пад столлю, даўнейшыя ботыафіцэркі ды шмат іншых прадметаў. На стале, што пасярэдзіне пакоя, быццам кароль на імянінах царыць даўнейшы патэфон з адкрыванымі дзверцамі — арыгінал. Так, памятаю, у нас пасля вайны быў такі. Бацька з Аўстрыі прывёз, як з канцлагераў вяртаўся дамоў. Сяброўкі сястры штонядзелю збіраліся і патанцоўкі на панадворку арганізавалі. Грампласцінкі з факстротамі і тангамі адно былі.

Развітваюся з прыяцелем і падаюся ў далейшае падарожжа. Напрамак — Полаўцы. Да гэтай прыгранічнай вёсачкі, захутанай паміж кустоў і сенажацей, не будзе больш чым паўтара-два кіламетры. Гасцяваў я ў Полаўцах неаднойчы. Аб праблемах жыхароў пісаў у сваіх допісах. Зараз бачу вынік гэтага. Раскіслая, месцамі непраезная, гравійка перамянілася ў шыкарную жвіроўку. На пачатку і ў канцы вёскі знаходзяцца табліцы з назвай салэцтва. Гміна задбала аб гэтым. Жыхарам застаецца адно чакаць абяцанай асфальтавай дарогі, якая спалучыць Чаромху-Станцыю (праз Ставішчы) з краёвай дарогай на пагранпераход. Інвестыцыя мела быць рэалізавана, здаецца, сёлета, але не збіраецца на гэта. Хоць ліпень канчаецца, але на палях прыкмячаю шматлікія палеткі з некошаным жытам. Пачарнелае ад дажджу калоссе чакае спрыяльнага надвор'я для ўборкі.

На пагранпераходзе чарга з польскага боку невялікая — аўтамабіляў не больш чым дваццаць пяць. Пад'язджаю да вартоўні. Вітаюся з вайскоўцам пагранічнай стражы.

— Прыехаў пра навінкі спытаць, ды ў „Ніву" напісаць, — кідаю ў бок сімпатычнага вартаўніка. — Знаёміцца, лічу, няма патрэбы. Вы ж мяне ведаеце...

— Ведаю, ведаю, — з усмешкай адказвае суразмоўца. Пачаткова загаварылі мы аб чарзе на пляцоўцы, затым аб ліквідацыі „Бэлы" і аб прадбачаных зменах на пагранпераходзе.

— А чаму „Бэлу" ліквідавалі? — цікаўлюся.

— З 1 ліпеня г.г. закрылі „зялёную" ды „чырвоную" (так называлі наведвальнікі бязмытныя крамы на беларускім баку, — паясняе вайсковец. — Лукашэнка хоча, каб беларускія тавары (гарэлку і папяросы — У.С.) там прадавалі, а калі не, дык хоць у 50 працэнтах. Не ведаю, чым гэта закончыцца...

— Дык зараз і на падсадку „мурашкі" не ездзяць?

— Няма сэнсу, бо на граніцы нічога не купляць, а беларуская гарэлка дорага абыходзіцца...

— А як са зменай статуса гэтага перахода; гаварылася, што з 1 ліпеня „міжнародны" атрымае? — працягваю размову.

— Так казалі, — пагаджаецца субяседнік. — Была нават гаворка, што паласу лесу сумяжуючую з пераходам маюць высякаць. Але ўсё сціхла. Мабыць, чакаюць нашага ўваходу ў структуры Шэнген. Тады раздзеляць супольны дагэтуль пашпартна-мытны кантроль з беларускім бокам ды новы закон аб пагранпераходах будзе ўведзены.

Пасля амаль паўгадзіннай размовы з вартаўніком пагранічнай стражы я збіраюся дамоў. Чарга ўменшылася напалову. Пашпартна-мытны кантроль па абодвух баках праходзіў акуратна. З нашага боку ў большасці праязджалі машыны на беларускіх рэгістрацыйных табліцах. З польскіх трапляліся адно з бельскімі і сямятыцкімі табліцамі. Вяртаючыся праз вуліцу Фабрычную ў Чаромсе наведаў я свайго сардэчнага сябру Янку Кубіцкага. Абмяняліся навінкамі. Дахаты вярнуўся пры захадзе сонца. Так закончылася мая вандроўка ў апошнюю нядзелю ліпеня.

Уладзімір СІДАРУК

Культура ў Новым Двары

Размова з дырэктарам Навадворскага асяродка культуры Кшыштафам ХАЙНАЦКІМ.

— ***Якія мерапрыемствы ладзіць Ваш асяродак у гадавым маштабе?***

— У пачатку ліпеня арганізуем Дні Новага Двара. У спартыўнай частцы адбываюцца спаборніцтвы футбалістаў з тэрыторыі нашай і суседніх гмін. Ладзім таксама Экалагічны бег „U źródeł Biebrzy" на дыстанцыі каля пяці кіламетраў для сеніёраў; удзельнічае ў ім каля дваццаці бегуноў з тэрыторыі нашай гміны. Апрача гэтага адбываецца яшчэ карацейшы бег, толькі па Новым Двары, для дзяцей, які збірае каля сарака ўдзельнікаў. Адбываюцца таксама нетыповыя і развесяляльныя спаборніцтвы між салэцтвамі, напр. гонкі ў мяшках.

На мастацкую частку запрашаем па два-тры калектывы з Беластока, Ліпска ці Саколкі, штогод іншыя. У Сынкоўцах сёлета канцэртавалі „Прымакі".

У мінулым годзе на восені пачалі мы мерапрыемствы з цыкла інтэграцыі культур. Канцэртавалі тады польскі бяседны і цыганскі калектывы. Сёлета думаем наладзіць польска-ўкраінскую сустрэчу і запрасіць нейкі ўкраінскі калектыў.

У час канікул арганізуем футбольны турнір, бегі, веласіпедны рэйд, шахматныя спаборніцтвы, пінг-понгавыя змаганні, валейбольныя матчы.

Ад двух гадоў удзельнічаем у Кветным бегу памяці Яна Паўла II, які адбываецца ў пачатку чэрвеня.

У пачатку студзеня адбываецца ў бібліятэцы дзіцячы канцэрт калядак і пастаралак. Прымае ў ім удзел каля дваццаці асоб у дуэтах, трыо ці ў сольным выкананні.

Пад Вялікдзень адбываецца конкурс пальмаў і пісанак, да якога прыступае таксама каля дваццаці асоб.

Ну, і курыруем таксама іншыя адборы да павятовых конкурсаў.

— ***А якія формы пастаяннай працы вядзе Ваш асяродак?***

— У нас працуе Kółko Sprawnych Rąk, у рамках якога праходзяць заняткі па вязанню кручком ці іншым рукадзеллі. Іншых гурткоў зацікаўленняў няма з прычыны недахопу інструктараў.

У бібліятэцы з восьмай гадзіны раніцы да пятай вечара дзейнічае няплатная інтэрнэтавая кафэйка. Наведвае яе ў прынцыпе школьная моладзь, часам нават тлумна.

— ***Якія мастацкія калектывы працуюць на тэрыторыі Навадворскай гміны?***

— Гэта „Дваранкі" з Хільмонаў-Калоніі, якія два гады таму адзначалі 25-годдзе. Думаем пра іх амаладжэнне. Прапанавалі мы дадаць ім акардэаніста з Грабянёў-Калоніі, але яны не захацелі, апасаліся, што не зладзяцца з ім у музычным плане.

— ***Якімі аб'ектамі карыстаецца Ваш асяродак?***

— Гэта наш будынак з глядзельна-танцавальнай залай. Карыстаемся таксама гімнастычнай залай і спартыўнай пляцоўкай навадворскай школы.

Працуюць чатыры вясковыя святліцы: у Дубасне, Плебаноўцах, Хільмонах і Канюшках (апошняя ў прыватнай хаце). Ёсць там святліцовыя, якія працуюць у сярэднім па дзве гадзіны ўдзень.

— ***А святліца ў Сынкоўцах?***

— Гэта будынак пажарнага дэпо, які курыруе тамашні солтыс. Бывае, што ладзяць там дыскатэкі.

— ***Ці ёсць па вёсках бібліятэкі?***

— Калісь светліцовыя бралі кнігі, а цяпер асталася толькі адна бібліятэка, якая месціцца ў будынку гімнастычнай залы нашай школы. І яшчэ ёсць школьныя бібліятэкі ў школах у Новым Двары і Серуцёўцах.

— ***А з якімі ўстановамі супрацоўнічаеце?***

— З Ваяводскай і Маршалкоўскай

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

управамі ды са Старостам — даем ім інфармацыі для іхніх бюлетэняў. Супрацоўнічаем са школамі. Разам з мясцовым атрадам Гранічнай стражы ладзім нашы мерапрыемствы; яны нам многа дапамагаюць.

— ***А якім чынам запрашаеце ў Сынкоўцы „Прымакоў"; ці карыстаецеся нейкім пасрэдніцтвам, напрыклад Беларускага грамадска-культурнага таварыства?***

— У „Прымакоў" шафёр родам з Сынкоўцаў. І ён, калі калектыў апрацоўвае свой гадавы план канцэртаў, дамагаецца ўнясення ў яго і выступлення ў сваёй вёсцы.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

9 ☞працяг

ад двух дзён да двух тыдняў, даўжэй наогул замежнікі, а патрабаванні на разнародныя формы адпачынку растуць разам з колькасцю дзён, на якія астаюцца, таму не павінны здзіўляць прапановы ў Гайнаўцы, каб пасля актыўнага дня на веласіпедных шляхах, прычым на веласіпедах нанятых у Гайнаўцы, вечарам турысты ішлі гуляць з мясцовымі ў кеглі. Таксама наракаюць на недахоп месц са свойскай ежай, карчмаў, якія ў Польшчы цяпер растуць хутчэй за грыбы, кавярняў. На гэта нават мясцовыя наракаюць. Трэба ў пару словах сказаць пра „Бар у Валодзі". Гэта адзіны гайнаўскі турыстычны прадукт, такой папулярнасці не мае ні фестываль царкоўнай музыкі, ні арганны фестываль. Не было б праблемы, каб бар функцыянаваў згодна з санітарнымі патрабаваннямі ды падатковымі, а горад не мае справы ва ўтрымліванні такога аб'екту, тым больш, што ўжо апрацоўваюцца планы добраўпарадкавання цэнтра, у якіх не будзе месца на „Бар у Валодзі".

Не мае таксама Гайнаўка вядомага мерапрыемства. Шкада, навакольныя гміны маюць фолькавыя і археалагічныя фестывалі, а Гайнаўка мае фінал конкурсу радыёвай песні. Факт, гэта агульнапольскі конкурс, але ці цікавы турыстычна? Мае ўражанні падказваюць, што людзі прыязджаюць часцей на канцэрт зоркі, бо гэта адзінае здаецца ў годзе мерапрыемства, калі гледачам іграюць польскія „Джэм" ці „Стахурскі". Добрай думкай ёсць Ярмарка зубра, але арганізатары павінны прадумаць канцэпцыю гэтага мерапрыемства.

Сяджу сабе ў Цэнтры турызму і слухаю як тэлефанічна інфармуюць пра атракцыі Гайнаўкі: сабор Святой Тройцы, арганы ў касцёле, Музей і асяродак беларускай культуры, Музей кавальства, Бар у Валодзі (які да канца невядома ці працуе), запаведнік зуброў, чыгунка ў Тапіла, музей у Белавежы. Прызнаюся, што цешыць трэцяе месца беларускага музея. Усе наракаюць на яго кепскую прамоцыю, з чым да канца не згодны працаўнікі, робяць што магчыма ў іхніх умовах, а не маюць лёгка, музей у Гайнаўцы трактуецца „памачышаму", а пэўна мала хто знае колькі турыстаў заглядае ў музей, у вакацыйны час гэта ў сярэднім каля 20 наведвальнікаў у дзень і гэта не жыхары Гайнаўкі.



А як да сітуацыі ставяцца жыхары Гайнаўкі? Пракаментаваў мне тое Рафал Андрасюк, які на патрэбы сваёй дысертацыі вёў апытанні, асабліва сярод маладых людзей. Папершае заўважаюць большую колькасць інвестыцый з еўрасаюзных сродкаў, што спрыяе функцыянальнасці ды эстэтыцы горада. Пацвярджае гэта і спадар Стэпанюк, Гайнаўка даволі высока ў рэйтынгах карыстання з еўрасаюзных грошай. Адначасова наракаюць на марудны тэмп зменаў. Нічога дзіўнага, калі ў старостве расказвалі мне пра рэалізаваную праграму развіцця трансгранічнага турызму дык прызнаваліся, што ўсюды бракуе людзей і заангажавання. Апытваныя наракаюць, што ўлады не працуюць на тое, каб пераконваць маладых да сябе і горада. Тыя выязджаюць каб не спыніць свайго развіцця, бо так бачаць будучыню ў Гайнацы. Маладыя думаюць пра сябе як пра рэальнага партнёра ў стратэгіі развіцца культурнага жыцця, што пацвярджаюць многімі цікавымі ідэямі. На жаль, толькі яны бачаць сябе ў такі спосаб. Чакаюць дапамогі ў сітуацыі развівання ўласных думак і малых прадпрыемстваў. У турызме бачаць шанс на разбуджэнне ў гайнавян веры ў свае магчымасці і мабільнасць. У крайніх выпадках сцвярджаюць, што ў выпадку браку дапамогі ўлад чакаюць толькі, што не будуць проста перашкаджаць. Маладыя хочуць выйсці з культурай на вуліцы, да людзей. Водгукам на гэта ёсць пэўна планы мадэрнізацыі гарадскога парку, дзе магчыма паяўляцца будуць, між іншым, скульптуры, якія паўстаюць у час мастацкіх пленэраў. Гэта яшчэ планы, але намеснік бурмістра пераконвае, што ідэі ёсць і напэўна вынікі пабачым. Падкрэслівае, што ў сферы культуры большасць залежыць ад кіраўнікоў устаноў, прычым звяртае ўвагу ўсіх на дзейнасць „Сяла Буды", „Царскага рэстарана", „Цэнтра прамоцыі Чарлёнка", галерэі ў Тэрэмісках ці гайнаўскіх: дому культуры і беларускага музея.

Самая прырода не хопіць, каб Гайнаўка прыцягала і магнетызавала. Як відна, перад уладамі і жыхарамі яшчэ агромная колькасць працы. Усе прызнаюць гэта хорам. Прынамсі ў адным усе згодныя. Чамусьці аднак не цешыць паўсюдная згода, калі ўсё ж такі брак Гайнаўцы дынамікі ў развіцці пры так шырокіх планах і далёкіх перспектывах.

Ілона КАРПЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

ПРЫКМЕТЫ ДЛЯ СНОБА

Хто першы сказаў гарадзенскаму мастаку Алесю Падарункаву пра тое, што жанчына з пустымі вёдрамі гэта кепская прыкмета, ён не ўспомніў бы нават на дыбе. Бо ніколі не верыў у народныя, як ён іх называў, забабоны. Смяяўся з тых людзей, хто палохаецца прыкметаў, як з дрымучых, цёмных, адсталых, сярэднявечных, неадукаваных, прымітыўных, не інтэлектуальных і несучасных прадстаўнікоў архаічнай, дапатопнай, занядбанай, непісьменнай, дурной, пераселенай у правінцыяльныя гарады з глухіх вёсак і закінутых хутароў невялічкай і адсталай ад сучаснасці часткі беларускага грамадства. Бо лічыў сябе натхнёным, мэтанакіраваным, рашучым, працавітым, разумным, праеўрапейскім і надзвычай мудрым прадстаўніком новай фармацыі людзей, якая сама робіць свой лёс не ўзіраючыся на прыкметы, гараскопы і прадказанні. Таму, калі на ранку аднаго дня, як ён пасля душу і ранішняй прабежкі, гладка паголены, у накрухмаленай новенькай кашулі, у перавязаным праз шыю чырвоным гальштуку і бялюткім як снег любімым плашчы рушыў да сябе ў майстэрню, і яму дарогу перайшла брудная, у падзёртай вопратцы, бяздомная і страшная як сем смерцяў бабулька з дзвюма пустымі вёдрамі, мастак толькі крыва ўсміхнуўся, пагардліва паглядзеўшы зверху ўніз на абяздоленую асобу. Ды яшчэ падумаў, што тая сама выбрала сабе такое жыццё. А яе пустых вёдраў хай баяцца тупыя інфузорыі. Але не ён. Бо не верыць у гэтую тупую бязглуздзіцу, не верыў ад пачатку і ніколі не паверыць.

У гэты жоўта-чырвоны ад кляновага лісця цёплы восеньскі дзень Падарункава цікавілі зусім іншыя асобы і ён, з ліслівай усмешкай на вуснах, інтэлігентна і паважна, час ад часу здымаў па дарозе свой капялюш з шырокімі палямі перад знаёмымі асобамі з багемнай тусоўкі або проста перад маладымі прыгожымі кабетамі.

Алесь сёння меўся закончыць працу над чарговай карцінай і ў думках ужо бачыў шчаслівыя вочы багатага заказчыка, які ў мастацтве дуб дубам і заказаў малюнак пад колер хатніх шпалераў. Мастак так і зрабіў. І цяпер чакаў добрага ганарару ад таўстамордага бізнесмена.

Ды так не пайшло як думалася. Першым настрой яму сапсаваў любімы сынок. Гэта быў падлетак, які лічыў сябе ўжо дастаткова дарослым, каб шэпатам пасылаць бацьку ў дупу, і каб не баючыся, адкрыта, лаяцца матам і курыць у прысутнасці маці.

— Я сёння дахаты не прыйду, — паставіў ён па тэлефоне бацьку перад фактам. — Я запрошаны на дзень нараджэння. Грошы ўзяў у шафцы.

— І колькі ты ўзяў? — пацікавіўся галава сям'і.

— Не ведаю, — адказаў Падарункаў-малодшы. — Не лічыў. Колькі там было, столькі і забраў.

Ды на гэтым не скончылася. Праз хвіліну патэлефанавала каханая жонка.

— У нас сёння прэзентацыя, — паведаміла яна. — Таму я крыху затрымаюся на працы. Прыкладна да ранку.

— Ну то і я дахаты тады не пайду, — адказаў муж, камбінуючы, дзе і з кім яму лепш правесці час. Тым больш, што атрымае грошы ад кліента. — Буду працаваць цэлую ноч.

Але праз тры гадзіны ён ужо ведаў, што грошаў яму не ўбачыць, як сваёй патыліцы. Толькі мастак пакрыў свой „шэдэўр" лакам, як фарба пачала трэскацца і адлушчвацца ад палатна. Прама на вачах. Праз некалькі хвілінаў карціна стала падобнай на шпалеры заказчыка пасля землятрусу ў таго ў хаце.

— А каб яны паздыхалі, — у роспачы прашаптаў мастак. — Які лак падсунулі паганы.

Пасля прысеў і стаў думаць, чым яму заняцца. У галаву прыйшоў толькі адзін план. Пазнаёміцца з якой прывабнай жанчынай і запрасіць да сябе на каву. Тым больш, што сёння ўночы кватэра будзе пуставаць. Дачакаўшыся вечара, ён, да свайго багемнага прыкіду дадаў аранжавы шалік і паплёўся ў парк. Яна была ўжо там. Сядзела на лаўцы, адзінокая, сумная як цень пілігрыма, і рабіла выгляд, што чытае часопіс „На экранах Беларусі".

— А можа лепш паглядзець той экран у мяне ў хаце, — прапанаваў мужчына.

— Можа, — пагадзілася яна і паднялася з лаўкі.

Але тут, з гнёздаў над імі, ці то спалохаўшыся яе руху, ці то час ім прыйшоў, паўзляталі вароны. І ўсе, нібы згаворваючыся, сталі бамбіць парк птушыным памётам. Але галоўнай мішэнню, па нейкіх, толькі ім вядомых прычынах, выбралі чалавека ў белым плашчы.

— Добра што каровы не лётаюць, — паспрабаваў аджартавацца мастак, гледзячы на расчыненыя вочы і рот сваёй новай знаёмай.

А потым глянуў на сябе. І злавіў сябе на думцы, што каб быў абвешчаны конкурс на сама лепшы горшы дзень, то ён заняў бы сёння адно з прызавых месцаў. Белы плашч стаў рабым, як класічная квактуха. А палі капелюша аж сагнуліся ад цяжару птушыных прэзентаў. Мастак быў падобны на пудзіла, якое сяляне ставяць на палі, каб адганяць птушак. Ні пра якое запрашэнне жанчыны цяпер не было і мовы. Тым больш, што тая так сіганула ад яго, нібыта галантны як герой-палюбоўнік кавалер ператварыўся ў монстра з фільмаў жахаў, пра якія яна толькі што чытала ў „На экранах Беларусі".

Алесь хаваючыся як злодзей ад людзей прывалокся да пад'езда свайго дома. Ён зняў капялюш і акуратна паклаў яго ў сметніцу. Пасля тое сама зрабіў з плашчом і шалікам.

— Няўжо сапраўды тыя пустыя вёдры спрацавалі, — прабубніў няўдалы шукальнік прыгодаў, робячы крок да дому.

І тут яму дарогу пераляцеў кот. Чорны-чорны, як пафарбаваны чорнай фарбай вугаль.

„Нельга мне дахаты, — цяжка падумаў ён і лёг на лаўку побач з домам. — Хіба і мая каханая вырашыла, што сёння ўночы кватэра будзе пуставаць ды прыйшла з прэзентацыі раней, чым планавала. Ды і ці была тая прэзентацыя ўвогуле. Хіба нешта ёсць у тых чорных катах ды пустых вёдрах. Трэба было яшчэ на ранку, як дарогу перайшла баба з вёдрамі, вяртацца назад і не вылазіць".

І стаў засынаць, паглядаючы на акно сваёй кватэры, дзе на хвілінку запалілася святло, а пасля зноў патухла.

Віктар САЗОНАЎ

19.08 – 25.08

Баран (22.03. — 20.04.) Схільнасць да марнавання энергіі і часу. Старайся захоўваць памяркоўнасць, не перакрочвай усталяваных межаў, але і не адмаўляйся ад сваіх прынцыпаў. З 24.08. пачнуцца ў цябе новыя шанцы, лёгка будзеш ажыццяўляць змены; запануеш над кожнай сітуацыяй.

Бык (21.04. — 21.05.) Да 21.08. можаш ісці на кампраміс. Важныя размовы, дамовы. З 23.08. пагражаюць правалы, уяўнасць, мана іншых і твая. Замест кахання можа быць вельмі добрае сяброўства.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Не выбухвай з-за павольнасці іншых! Блізкіх заінспіруеш і натхнеш. У пары, калі былі скрыгіты — пачнецца спакой. Можаш сардэчна пагадзіцца з кімсьці, хто быў табе несімпатычны (сардэчнасці хопіць ненадоўга).

Рак (23.06. — 23.07.) 21-25.08. магчымыя вельмі прыкрыя сітуацыі ў міжчалавечых адносінах. Той, хто да цябе салодка ўсміхаецца, не мусіць жадаць табе аднаго дабра. З 24.08. неканвенцыянальныя дзеянні прынясуць карысці.

Леў (24.07. — 23.08.) Горшае самаадчуванне, немагчымасць зрэалізаваць тое, што хацелася б, фінансавыя завіраванні, надта многа абавязкаў. Ды пад канец тыдня пачнецца раўнавага ва ўсім.

Дзева (24.08. — 23.09.) Будзеш самаўпэўнены, справішся з усімі нават нечаканымі сітуацыямі. Не кіруйся прадузятасцямі. Не дзялі волас на чатыры. На галаву зваліцца работа, ды прыбытковая.

Шалі (24.09. — 23.10.) Будзеш бескрытычны, наіўны, даверлівы. Асцерагайся манюк, зялётнікаў. Не дайся злавіцца на ўяву залатых гор! Варта мець пры сабе сяброў.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Прыхільнасць кіраўніцтва. Маеш харызму! — пераканаеш усіх, асабліва супернікаў. З каханым нядаўна елі вы сабе з дзюбкі, цяпер будзеце сабе вырываць.

Стралец (23.11. — 22.12.) Асцерагайся бравурнасці і агрэсіўных паводзін, пазбягай канфліктаў з людзьмі. Асабліва сам не правакуй! У сямейных канфліктах памогуць сябры. Задавальненне тым, што маеш.

Казярог (23.12. — 20.01.) Будзеш паказваць сваю халаднакроўнасць, калі нават закіпіш ад злосці. Знаёмыя могуць цябе горка расчараваць. Асцерагайся дарагіх пакупак і пазычак.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Будзь асцярожны з новымі знаёмствамі. Затое старыя сябры будуць і падтрымкай, і асалодай. Адзінай матывіроўкай твайго дзеяння будуць цяпер грошы!

Рыбы (20.02. — 21.03.) Рыхтуючы якісьці праект, добра плануй. На працы будзеш сумленны і адданы, а твае амбіцыі не застануцца без рэха. Лішняя ды несубтыльная праўдамоўнасць — будзеш часам як слон у краме з парцалянай. Каб супакоіцца, еж прэпараты з магніем ды свежую гародніну і плады.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. урачыстая працэсія, 2. продаж гатовай прадукцыі, 3. мяч у варотах праціўніка — як сакол, 4. кітайская залатоўка, 5. ціхаакіянская дзяржава са сталіцай у Нукуалофе, 6. імклівая плынь у рацэ, вялікая хуткасць, 7. адзінства, згуртаванасць, супольнасць, 8. памяшканне, дзе знаходзяцца кацельныя ўстаноўкі, 9. асабісты дакумент патрэбны для падарожжаў у замежжа, 10. тонкая лёгкая сятчатая тканіна, 11. „адзінка" пражы, 12. струна, якая сцягвае канцы лука.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 28 нумара
Біржа, каса, Лена, маца, шах, ява, Ясь.

Рашэнне: **Аржаная каша сама сябе хваліць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960